ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
А.У. Кадлубай
7 жніўня 2023 г.

# ІНСТРУКТЫЎНА-МЕТАДЫЧНАЕ ПІСЬМО МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ АРГАНІЗАЦЫІ Ў 2023/2024 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ВА ЎСТАНОВАХ АДУКАЦЫІ, ЯКІЯ РЭАЛІЗУЮЦЬ АДУКАЦЫЙНУЮ ПРАГРАМУ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ, АДУКАЦЫЙНУЮ ПРАГРАМУ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ НА ЎЗРОЎНІ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ, АДУКАЦЫЙНУЮ ПРАГРАМУ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ НА ЎЗРОЎНІ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ ДЛЯ АСОБ З ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ НЕДАСТАТКОВАСЦЮ»

## АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ДЗЕЙНАСЦІ

Асноўнымі напрамкамі дзейнасці ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, іншых арганізацый, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць (далей – установы адукацыі), у 2023/2024 навучальным годзе з’яўляюцца:

павышэнне даступнасці і варыятыўнасці адукацыі з улікам адукацыйных патрэб выхаванцаў;

забеспячэнне здароўезберагальнага адукацыйнага працэсу ва ўстановах адукацыі на аснове міжведамаснага ўзаемадзеяння;

стварэнне развіццёвага прадметна-прасторавага асяроддзя, якое забяспечвае ў тым ліку задавальненне асаблівых адукацыйных патрэб выхаванцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця (далей – АПФР);

удасканаленне якасці адукацыйнага працэсу, забеспячэнне яго карэкцыйнай накіраванасці пры рабоце з асобамі з АПФР.

Да 2023/2024 навучальнага года для забеспячэння даступнасці, якасці і бяспекі адукацыйнага працэсу Міністэрствам адукацыі падрыхтаваны шэраг нарматыўных прававых актаў.

Так, з мэтай прывядзення актаў заканадаўства ў адпаведнасць з Законам Рэспублікі Беларусь ад 14 студзеня 2022 г. № 154-З «Аб змяненні

Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі» (далей – Кодэкс), а таксама для рэалізацыі названых напрамкаў дзейнасці ўстаноў адукацыі ў 2023/2024 навучальным годзе і ў наступныя гады распрацаваны і зацверджаны пастановамі Міністэрства адукацыі:

Палажэнне аб спецыяльным дзіцячым садзе (пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30 чэрвеня 2023 г. № 183, якая вызначае прадмет і парадак дзейнасці спецыяльнага дзіцячага сада, яго задачы, функцыі і структуру, віды груп спецыяльнага дзіцячага сада, а таксама парадак арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю;

тыпавы вучэбны план дашкольнай адукацыі (пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12 мая 2023 г. № 152), які ўстанаўлівае пералік адукацыйных галін, колькасць вучэбных гадзін на іх вывучэнне па групах выхаванцаў, максімальны дапушчальны аб’ём вучэбнай нагрузкі і агульную колькасць вучэбных гадзін на тыдзень пры арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстановах адукацыі, санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, дома.

Пры гэтым пералік адукацыйных галін, колькасць вучэбных гадзін на іх вывучэнне па групах выхаванцаў, максімальны дапушчальны аб’ём вучэбнай нагрузкі і агульная колькасць вучэбных гадзін на тыдзень паменшаны пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ў санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, а таксама дома.

Падрыхтаваны і зацверджаны:

інструктыўна-метадычнае пісьмо «Аб парадку арганізацыі засваення зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю дома». Пісьмо змяшчае рэкамендацыі па стварэнні ўмоў для забеспячэння якаснага і бяспечнага адукацыйнага працэсу па засваенні зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі дома, у тым ліку пры спалучэнні заняткаў дома і ва ўстановах адукацыі, для выхаванцаў, якія па медыцынскіх паказаннях пастаянна не могуць наведваць установы адукацыі;

метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі работы з выхаванцамі ўстаноў дашкольнай адукацыі, іх законнымі прадстаўнікамі па фарміраванні асноў грамадзянска-патрыятычнай культуры (далей – метадычныя рэкамендацыі). У метадычных рэкамендацыях прадстаўлены змест, формы і метады фарміравання асноў грамадзянска-патрыятычнай культуры, прававое і навукова-метадычнае забеспячэнне.

Дакументы, якія вызначаюць парадак арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстановах адукацыі, дома, а таксама арганізацыі работы з выхаванцамі ўстаноў адукацыі, іх законнымі прадстаўнікамі па фарміраванні асноў грамадзянска-патрыятычнай культуры, размешчаны на Інтэрнэт-партале Міністэрства адукацыі (*https://edu.gov.by/urovni-obrazovaniya/doshkolnoe-obrazovanie/doshkolnoe-obrazovanie/informatsiya/nauchno-metodicheskoe-obespechenie*), нацыянальным адукацыйным партале (*https://adu.by/ru/pedagogam/normativnye-pravovye-dokumenty.html*; *https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/doshkolnoe-obrazovanie.html*).

Міністэрства адукацыі *звяртае ўвагу* на неабходнасць своечасовага правядзення інфармацыйна-растлумачальнай работы ў частцы тлумачэння нарматыўных прававых актаў, інструктыўна-метадычных пісьмаў, метадычных рэкамендацый (калегіі, канферэнцыі, нарады, дыялогавыя пляцоўкі і інш.) сумесна з педагагічнымі работнікамі ўстаноў адукацыі, бацькамі (законнымі прадстаўнікамі), іншымі зацікаўленымі.

## ПАВЫШЭННЕ ДАСТУПНАСЦІ І ВАРЫЯТЫЎНАСЦІ АДУКАЦЫІ З УЛІКАМ АДУКАЦЫЙНЫХ ПАТРЭБ ВЫХАВАНЦАЎ

З мэтай забеспячэння візуалізацыі інфармацыі аб колькасці свабодных месцаў ва ўстановах адукацыі неабходна працягнуць работу:

па размяшчэнні ў кожнай установе адукацыі, упраўленні (аддзеле) адукацыі (па адукацыі) абл(гар)выканкамаў спасылкі на адрасы сайтаў у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт з інтэрактыўнымі картамі і інфармацыяй аб наяўнасці (адсутнасці) свабодных месцаў у кожнай установе адукацыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай (тэрытарыяльнай) адзінкі, яе своечасовай актуалізацыі (не менш за 1 раз на месяц);

паведамленні законных прадстаўнікоў непаўналетніх аб наяўнасці такой інфармацыі і забеспячэнні доступу да яе.

Прыём (залічэнне) асобы для атрымання дашкольнай адукацыі, спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі ажыццяўляецца на працягу каляндарнага года пры наяўнасці свабодных месцаў шляхам прыняцця рашэння (выдання загада) загадчыкам установы адукацыі аб

прыёме (залічэнні) асобы ва ўстанову адукацыі на падставе дакументаў, названых у пункце 1 артыкула 140 Кодэкса:

заявы законнага прадстаўніка гэтай асобы;

медыцынскай даведкі аб стане здароўя;

накіравання, выдадзенага мясцовым выканаўчым і распарадчым органам па месцы знаходжання ўстановы адукацыі, для атрымання дашкольнай адукацыі, спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі ў дзяржаўных установах адукацыі, прыватных установах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, фінансаванне часткі расходаў якіх ажыццяўляецца за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў;

заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі для атрымання дашкольнай або спецыяльнай адукацыі дома, у санаторных дзіцячых садах, санаторных групах, санаторных спецыяльных групах, санаторных групах інтэграванага навучання і выхавання ва ўстановах адукацыі;

заключэння дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі (далей – ЦКРНіР) для асоб з АПФР для атрымання спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі ў спецыяльных дзіцячых садах, спецыяльных групах, санаторных спецыяльных групах, групах інтэграванага навучання і выхавання, санаторных групах інтэграванага навучання і выхавання ва ўстановах адукацыі.

У адпаведнасці з артыкулам 139 Кодэкса выхаванцы аб’ядноўваюцца ў групы з улікам узросту на 1 верасня адпаведнага навучальнага года. Па жаданні аднаго з бацькоў (законных прадстаўнікоў) непаўналетняй асобы і на падставе заявы кіраўнік установы адукацыі можа прыняць рашэнне аб яго прыёме (залічэнні) ва ўзроставую групу з больш ранняга ўзросту пры наяўнасці ў ёй свабодных месцаў.

Варыянт 1. Дзіця 28.08.2021 года нараджэння падлягае прызначэнню ў першую малодшую групу (ад двух да трох гадоў), паколькі на 01.09.2023 яму споўнілася поўныя два гады. Пры гэтым дапускаецца прыём (залічэнне) у гэтую ж узроставую групу (пры наяўнасці ў ёй свабодных месцаў пасля залічэння дзяцей адпаведнай узроставай катэгорыі) дзяцей з 02.09.2021 па 31.12.2021 года нараджэння з прычыны таго, што два поўныя гады ім споўніцца ў бягучым каляндарным годзе.

Варыянт 2. Дзіця 19.02.2020 года нараджэння падлягае прызначэнню ў другую малодшую групу (ад трох да чатырох гадоў), паколькі на 01.09.2023 яму споўнілася поўныя тры гады. Пры гэтым дапускаецца прыём (залічэнне) у гэтую ж узроставую групу (пры наяўнасці ў ёй свабодных месцаў пасля залічэння дзяцей адпаведнай узроставай катэгорыі) дзяцей з 02.09.2020 па 31.12.2020 года нараджэння з прычыны таго, што поўныя тры гады ім спаўняецца ў бягучым каляндарным годзе.

Артыкулам 3 Кодэкса вызначаны дзяржаўныя гарантыі правоў грамадзян у сферы адукацыі. Так, у адпаведнасці з пунктам 2 названага артыкула грамадзяне Рэспублікі Беларусь маюць права на атрыманне ў дзяржаўных установах адукацыі бясплатнай дашкольнай і спецыяльнай адукацыі.

Пры рэалізацыі адукацыйных праграм на платнай аснове заключаецца дагавор аб аказанні паслуг (артыкул 59 Кодэкса), тыпавая форма якога ўстаноўлена пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 9 верасня 2022 г. № 297 (дадатак 10).

Спыненне адукацыйных адносін (адлічэнне) ажыццяўляецца ў выпадках і ў парадку, устаноўленых артыкулам 68 Кодэкса.

Датэрміновае спыненне адукацыйных адносін (адлічэнне) па ініцыятыве ўстановы адукацыі ажыццяўляецца ў выпадку бесперапыннай адсутнасці выхаванца на занятках без уважлівых прычын больш за 30 дзён.

Уважлівымі прычынамі адсутнасці могуць прызнавацца такія абставіны, якія аб’ектыўна перашкаджаюць законным прадстаўнікам выхаванца прывесці сваё дзіця ва ўстанову адукацыі, а менавіта:

хвароба дзіцяці;

санаторна-курортнае лячэнне або аздараўленне;

знаходжанне дзіцяці на дамашнім рэжыме (па рэкамендацыі ўстановы аховы здароўя);

неспрыяльная эпідэміялагічная сітуацыя;

наяўнасць лістка часовай непрацаздольнасці ў законных прадстаўнікоў выхаванца;

адпачынак законных прадстаўнікоў выхаванца;

службовая камандзіроўка законных прадстаўнікоў выхаванца;

выхадныя дні законных прадстаўнікоў выхаванца, у тым ліку тых, якія працуюць па рэжыме гнуткага рабочага часу, па графіку зменнасці, пры прадастаўленні дадатковага свабоднага ад работы дня на тыдні;

дыстанцыйная работа законных прадстаўнікоў выхаванца ў перыяд эпідэмічнага ўздыму захворвання;

часовая страта работы законных прадстаўнікоў выхаванца або прастой арганізацыі, у якой яны працуюць;

канікулы (летнія – 92 каляндарныя дні, зімовыя – 10 каляндарных дзён, вясновыя – 10 каляндарных дзён);

прадпісанне санітарна-эпідэміялагічнай службы аб закрыцці ўстановы адукацыі;

надыход надзвычайных абставін, у тым ліку часовае прыпыненне работы транспарту;

непрадбачаныя сямейныя абставіны (пераезд, смерць ці хвароба блізкіх сваякоў) і інш.

Паколькі дзяржавай гарантавана права на атрыманне адукацыі дзецьмі дашкольнага ўзросту, а дашкольная адукацыя не з’яўляецца абавязковай, названую меру (датэрміновае спыненне адукацыйных адносін) у дачыненні да дзяцей дашкольнага ўзросту (асабліва тых, якія наведваюць установу адукацыі ў сельскай мясцовасці) неабходна разглядаць з пункту гледжання яе *выключнасці*, а не эфектыўнасці.

*Звяртаем увагу*, што на падставе артыкулаў 136 і 265 Кодэкса тэрмін засваення зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі складае да пяці гадоў дзесяці месяцаў і можа быць павялічаны на адзін год па жаданні законных прадстаўнікоў выхаванцаў, а тэрмін атрымання спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі – на тэрмін ад аднаго года да двух гадоў на падставе заключэння ЦКРНіР.

Да моманту прыёму ў першы клас установы агульнай сярэдняй або спецыяльнай адукацыі і выдання кіраўніком установы адукацыі загада аб спыненні адукацыйных адносін з указаннем падставы для адлічэння дзіця з’яўляецца выхаванцам установы адукацыі і можа наведваць яе на агульных умовах.

Арганізацыя і функцыянаванне груп кароткачасовага знаходжання выхаванцаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Метадычнымі рэкамендацыямі па арганізацыі адукацыйнага працэсу ў групах кароткачасовага знаходжання (ад 2 да 7 гадзін) ва ўстановах, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі (*https://edu.gov.by/urovni-obrazovaniya/doshkolnoe-obrazovanie/doshkolnoe-obrazovanie/informatsiya/nauchno-metodicheskoe-obespechenie*), з улікам выканання санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў.

*Звяртаем увагу*, што сумесна з зацікаўленымі асобамі павінна быць забяспечана ў поўнай меры (пры неабходнасці) магчымасць атрымання дашкольнай адукацыі дома для дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту, якія па медыцынскіх паказаннях пастаянна не могуць наведваць установу адукацыі. Атрыманне дашкольнай адукацыі дома названай катэгорыяй дзяцей павінна ажыццяўляцца з улікам патрабаванняў Інструкцыі аб парадку арганізацыі засваення зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі дома (пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 25 ліпеня 2022 г. № 204), палажэнняў інструктыўна-метадычнага пісьма «Аб парадку арганізацыі засваення зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю дома».

Пералік медыцынскіх паказанняў для атрымання дашкольнай адукацыі дома вызначаны пастановай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 3 чэрвеня 2022 г. № 50.

Інфармацыя пра выпадкі датэрміновага спынення адукацыйных адносін (адлічэнне) выхаванцаў, уважлівыя прычыны іх адсутнасці ва ўстанове адукацыі, тэрміны засваення імі зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, парадак арганізацыі атрымання дашкольнай адукацыі дома павінна ў абавязковым парадку своечасова даводзіцца да ведама бацькоў (законных прадстаўнікоў) выхаванцаў.

## ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЗДАРОЎЕЗБЕРАГАЛЬНАГА АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ВА ЎСТАНОВАХ АДУКАЦЫІ НА АСНОВЕ МІЖВЕДАМАСНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

### Забеспячэнне бяспечных і здароўезберагальных умоў ва ўстановах адукацыі, прафілактыка дзіцячага траўматызму

Падпунктам 4.5 пункта 4 артыкула 19 Кодэкса вызначана, што стварэнне бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу з’яўляецца абавязкам установы адукацыі.

Права навучэнцаў на ахову жыцця і здароўя падчас адукацыйнага працэсу рэгламентавана падпунктам 1.8 пункта 1 артыкула 30 Кодэкса.

З гэтымі мэтамі пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 3 жніўня 2022 г. № 227 зацверджаны Правілы расследавання і ўліку няшчасных выпадкаў, якія адбыліся з навучэнцамі пры засваенні зместу адукацыйных праграм, з выхаванцамі пры рэалізацыі праграм выхавання, Правілы бяспекі арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, Правілы бяспекі арганізацыі адукацыйнага працэсу, арганізацыі выхаваўчага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі (далей – Правілы). Правілы размешчаны на Інтэрнэт-партале Міністэрства адукацыі (*https://edu.gov.by/urovni-obrazovaniya/doshkolnoe-obrazovanie/doshkolnoe-obrazovanie/normativnye-pravovye-akty*), нацыянальным адукацыйным партале (*https://adu.by/ru/pedagogam/normativnye-pravovye-dokumenty.html*).

Правіламі вызначаны патрабаванні да арганізацыі прапускнога рэжыму, бяспечнага знаходжання выхаванцаў ва ўстанове адукацыі і на яе тэрыторыі, па забеспячэнні бяспекі выхаванцаў пры арганізацыі прагулкі, правядзенні экскурсіі і інш.

За стварэнне здаровых і бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстанове адукацыі кіраўнік установы адукацыі,

педагагічныя работнікі нясуць персанальную адказнасць у адпаведнасці з палажэннямі Адзінага кваліфікацыйнага даведніка пасад служачых «Пасады служачых, занятых у адукацыі» (выпуск 28), зацверджанага пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь ад 29 ліпеня 2020 г. № 69 (далей – АКДПС). *Звяртаем увагу*, што гэта палажэнне павінна быць у абавязковым парадку замацавана ў службовых інструкцыях педагагічных работнікаў.

Неабходна сістэматычна аналізаваць прычыны атрымання траўмаў выхаванцамі ва ўстанове адукацыі, ліквідаваць умовы, якія ім спрыяюць, на пастаяннай аснове не радзей за адзін раз на паўгоддзе разглядаць пытанні стану траўматызму выхаванцаў і забеспячэння бяспекі іх жыццядзейнасці ва ўстанове адукацыі на пасяджэннях педагагічных саветаў устаноў адукацыі, калегій структурных падраздзяленняў гарадскіх, раённых, абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў, мясцовых адміністрацый раёнаў у гарадах, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі (далей – органаў кіравання адукацыяй), планаваць і праводзіць мерапрыемствы з улікам распрацаваных рэгіянальных міжведамасных комплексаў першачарговых мер па прафілактыцы і папярэджанні траўматызму навучэнцаў ва ўстановах адукацыі.

З гэтымі мэтамі неабходна:

забяспечыць асаблівы кантроль за выкананнем патрабаванняў нарматыўных прававых актаў, палажэнняў інструктыўна-метадычных пісьмаў, рашэнняў калегій Міністэрства адукацыі ў частцы забеспячэння бяспечных умоў знаходжання навучэнцаў, выключэння магчымасці стварэння перадумоў для ўзнікнення надзвычайных сітуацый;

прымаць неадкладна адпаведныя меры рэагавання пры незабеспячэнні бяспечных умоў знаходжання выхаванцаў ва ўстанове адукацыі з мэтай выключэння выпадкаў халатнага стаўлення педагагічных і іншых работнікаў да сваіх службовых абавязкаў;

працягваць правядзенне мерапрыемстваў па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі, у тым ліку абсталяванні сістэмамі бяспекі (сістэмамі відэаназірання, аўтаматычнай пажарнай сігналізацыі і абвяшчэння аб пажары, перадачы паведамленняў аб пажары «Маланка», ручнымі сістэмамі трывожнай сігналізацыі), паэтапнай устаноўцы на дзвярах запасных выхадаў электрамагнітных замкоў з функцыяй аўтаматычнай разблакіроўкі пры надзвычайнай сітуацыі, на агароджы тэрыторыі (варотах, брамах) электрамеханічных замкоў і дамафонных сістэм з магчымасцю дыстанцыйнага кіравання, званкоў; стварэнні на базе ўстаноў адукацыі аўтапляцовак з дарожнай разметкай, аўтагарадкоў і інш.;

уключаць пытанні фарміравання здаровага ладу жыцця, прафілактыкі вулічнага і бытавога траўматызму, бяспечных паводзін дзяцей на дарозе,

вадзе і паблізу вадаёмаў, папярэджання пажараў, дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам непаўналетніх у тэматычныя мерапрыемствы інфармацыйна-растлумачальнай і выхаваўча-прафілактычнай накіраванасці з выхаванцамі і іх бацькамі (законнымі прадстаўнікамі), педагагічнымі работнікамі (абласныя (раённыя, гарадскія) акцыі, інфармацыйна-адукацыйныя праекты і конкурсы, дыялогавыя пляцоўкі, дыскусійныя платформы, інфармацыйныя сустрэчы, анлайн-форумы, інтэрактыўныя пляцоўкі, заняткі з праглядам навучальных фільмаў і іншыя мерапрыемствы, накіраваныя на папулярызацыю здаровага ладу жыцця, прапаганду бяспекі жыццядзейнасці). Мэтазгодным будзе ўдзел у такіх мерапрыемствах прадстаўнікоў сістэмы аховы здароўя, органаў дзяржаўнага пажарнага нагляду, упраўленняў (аддзелаў) унутраных спраў гарадскіх, раённых выканаўчых камітэтаў (мясцовых адміністрацый раёнаў у гарадах), іншых зацікаўленых;

размяшчаць у бацькоўскіх чатах у месенджарах і сацыяльных сетках тэматычныя агляды аб мерапрыемствах, якія праводзяцца па пытаннях фарміравання здаровага ладу жыцця, аховы жыцця і здароўя дзяцей, забеспячэння іх бяспечнай жыццядзейнасці, прафілактыцы дзіцячага траўматызму, аб адказнасці законных прадстаўнікоў выхаванцаў за пакіданне дзяцей без нагляду;

ажыццяўляць выпуск тэматычных брашур, памятак, буклетаў для выхаванцаў і іх законных прадстаўнікоў па адзначаных напрамках у межах міжведамаснага ўзаемадзеяння;

аператыўна інфармаваць аб надзвычайных сітуацыях ва ўстанове адукацыі;

асвятляць эфектыўны вопыт педагагічных работнікаў, бацькоў (законных прадстаўнікоў) выхаванцаў па названых напрамках у сродках масавай інфармацыі.

**Забеспячэнне псіхалагічнай бяспекі выхаванцаў ва ўстанове адукацыі**

Адной з функцый установы адукацыі ў адпаведнасці з Палажэннем аб установе дашкольнай адукацыі (пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 4 жніўня 2022 г. № 230), Палажэннем аб спецыяльным дзіцячым садзе (пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30 чэрвеня 2023 г. № 183) з’яўляецца забеспячэнне сацыяльна-педагагічнай падтрымкі выхаванцаў і аказанне ім псіхалагічнай дапамогі.

Сацыяльна-педагагічная падтрымка навучэнцаў і аказанне ім псіхалагічнай дапамогі ва ўстановах адукацыі павінны адбывацца ў адпаведнасці з Інструкцыяй аб парадку сацыяльна-педагагічнай падтрымкі навучэнцаў і аказання ім псіхалагічнай дапамогі (пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 20 верасня 2022 г. № 328). Аказанне

псіхалагічнай дапамогі навучэнцам ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым Законам Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 г. № 153-З «Аб аказанні псіхалагічнай дапамогі».

Ва ўстанове адукацыі неабходна стварыць умовы для забеспячэння псіхалагічнай бяспекі, якая характарызуецца адсутнасцю негатыўных умоў для псіхічнага развіцця і выключае ўнутраныя і знешнія пагрозы псіхічнаму здароўю дзіцяці як ва ўстанове дашкольнай адукацыі, так і па-за ёй.

Выхавацелі дашкольнай адукацыі і іншыя педагагічныя работнікі павінны звяртаць увагу на неабгрунтаваныя змены ў эмацыянальных і паводзінных рэакцыях дзіцяці (пераменлівы фон настрою, заніжаная самаацэнка, павышаная трывожнасць, агрэсіўнасць, неадэкватныя сюжэты ролевых гульняў і інш.). У выпадку падазрэння на наяўнасць фактараў, якія негатыўна ўплываюць на псіхічны дабрабыт выхаванцаў, педагагічныя работнікі абавязаны неадкладна паведаміць кіраўніцтву ўстановы адукацыі.

Педагагічныя работнікі павінны выкарыстоўваць у адукацыйным працэсе псіхалагічныя веды, накіраваныя на вырашэнне канфліктных сітуацый, стварэнне спрыяльнага псіхалагічнага клімату ў дзіцячых калектывах.

Педагогам-псіхолагам устаноў адукацыі неабходна ажыццяўляць сваю дзейнасць у цесным кантакце з выхавацелямі дашкольнай адукацыі і іншымі педагагічнымі работнікамі, сістэматычна ўключацца ў работу груп установы адукацыі для рэалізацыі комплексу мерапрыемстваў, накіраваных на псіхалагічную асвету суб’ектаў адукацыйных адносін.

З мэтай ранняга выяўлення сітуацый, якія негатыўна ўплываюць на псіхічнае здароўе непаўналетніх, педагогу-псіхолагу варта пры неабходнасці прымаць удзел у першасным знаёмстве дзіцяці і яго бацькоў з установай адукацыі для больш поўнага вывучэння дзіцяці і ўмоў сямейнага выхавання. Мэтазгодна прадугледзець прысутнасць педагогаў-псіхолагаў на гутарцы кіраўнікоў установы адукацыі з прэтэндэнтамі на вакантныя пасады педагагічных работнікаў.

Ва ўстановах адукацыі неабходна сістэматычна праводзіць з усімі суб’ектамі адукацыйных адносін інфармацыйна-асветніцкія мерапрыемствы, накіраваныя на стварэнне атмасферы нецярпімасці да ўсіх праяў жорсткасці і гвалту ў адносінах да дзяцей, прафілактычныя мерапрыемствы, накіраваныя на своечасовае папярэджанне магчымых парушэнняў у станаўленні і развіцці асобы непаўналетняга і міжасобасных адносінах (загад Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 15 лютага 2018 г. № 119а «Аб мерах, накіраваных на прафілактыку здзяйснення злачынстваў ва ўстановах адукацыі ў адносінах да навучэнцаў»). Звяртаем увагу на неабходнасць няўхільна пратрамлівацца Алгарытму інфармавання педагагічнымі работнікамі бацькоў, апекуноў, папячыцеляў навучэнцаў і

(або) супрацоўнікаў унутраных спраў аб наяўнасці прымет гвалту ў адносінах да непаўналетніх, асноўнай мэтай якога з'яўляецца своечасовая дапамога ў рэабілітацыі непаўналетніх, якія падвергліся гвалту.

*Звяртаем увагу*, што ў выпадку неабходнасці атрымання суб'ектамі адукацыйных адносін комплекснай псіхалагічнай дапамогі і сацыяльна-педагагічнай падтрымкі ў крызісных сітуацыях удзельнікі адукацыйнага працэсу могуць звяртацца ў Рэспубліканскі цэнтр псіхалагічнай дапамогі (далей – Цэнтр) (*https://rcpp.by*). З мэтай інфармавання ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу рэкамендуецца размясціць інфармацыю аб дзейнасці Цэнтра з указаннем адраса яго інтэрнэт-сайта, тэлефона на інфармацыйных стэндах, афіцыйных інтэрнэт-сайтах устаноў адукацыі, у бацькоўскіх чатах у месенджарах і сацыяльных сетках.

Прафілактыка сямейнага недабрабыту павінна заставацца прыярытэтнай у рабоце ўстаноў адукацыі, паколькі захаванне дзіцяці ў роднай сям'і з'яўляецца самым эфектыўным вынікам міжведамаснага ўзаемадзеяння. З мэтай выканання патрабаванняў пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 студзеня 2019 г. № 22 «Аб прызнанні знаходжання дзяцей у сацыяльна небяспечным становішчы» ў дзейнасці неабходна кіравацца Метадычнымі рэкамендацыямі па міжведамасным узаемадзеянні дзяржаўных органаў, дзяржаўных і іншых арганізацый пры выяўленні неспрыяльнай для дзяцей абстаноўкі, правядзенні сацыяльнага расследавання, арганізацыі работы з сем'ямі, дзе прызнана, што дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, зацверджанымі намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь 1 кастрычніка 2019 г.

## СТВАРЭННЕ РАЗВІЦЦЁВАГА ПРАДМЕТНА-ПРАСТОРАВАГА АСЯРОДДЗЯ, ЯКОЕ ЗАБЯСПЕЧВАЕ Ў ТЫМ ЛІКУ ЗАДАВАЛЬНЕННЕ АСАБЛІВЫХ АДУКАЦЫЙНЫХ ПАТРЭБ ВЫХАВАНЦАЎ З АПФР

Развіццёвае прадметна-прасторавае асяроддзе ва ўстанове адукацыі арганізуецца з улікам патрабаванняў адукацыйнага стандарту дашкольнай адукацыі (пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 4 жніўня 2022 г. № 228), вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі (пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 4 жніўня 2022 г. № 229), пералікаў абсталявання для ўстаноў адукацыі (пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 24 верасня 2007 г. № 50), пералікаў мэблі, інвентару і сродкаў навучання, неабходных для арганізацыі адукацыйнага працэсу ўстановамі адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, іншымі арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай

адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі (пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12 чэрвеня 2014 г. № 75), пералікаў і норм забеспячэння спартыўным інвентаром і абсталяваннем (пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 14 ліпеня 2014 г. № 105), узроставых і індывідуальных асаблівасцей дзяцей, у тым ліку з АПФР, матэрыяльных і архітэктурна-прасторавых асаблівасцей памяшканняў і тэрыторыі ўстановы адукацыі, іншых нарматыўных прававых і тэхнічных нарматыўных прававых актаў.

*Бяспека і экалагічнасць* прадметна-прасторавага асяроддзя прадугледжвае адпаведнасць усіх яго элементаў патрабаванням па забеспячэнні надзейнасці і бяспечнасці іх выкарыстання.

Дапускаецца прымяненне ў адукацыйным працэсе фізкультурна-спартыўнага і гульнявога абсталявання на тэрыторыі ўстановы адукацыі, спартыўнага інвентару, па канструкцыі, памерах, выкарыстаных матэрыялах адпаведнага ўзроставым і псіхафізічным асаблівасцям выхаванцаў, патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў. Абсталяванне і інвентар павінны быць водаўстойлівымі і добра паддавацца ачыстцы.

Пры арганізацыі розных відаў дзіцячай дзейнасці, у тым ліку пазнавальнай, гульнявой і працоўнай, важна забяспечыць выхаванцаў інвентаром і гульнявым абсталяваннем, якія павінны знаходзіцца ў спраўным стане, што дазваляе суадносіць рухальную нагрузку ў залежнасці ад пары года і ўзросту навучэнцаў.

У адукацыйным працэсе неабходна выкарыстоўваць спраўныя і бяспечныя сродкі навучання і выхавання (напрыклад, нажніцы з тупымі канцамі, малаток з закругленай ударнай часткай, інвентар пры выкананні работ на ўчастку з трывалым мацаваннем і інш.) з улікам узросту выхаванцаў.

Пры арганізацыі развіццёвага прадметна-прасторавага асяроддзя не менш важныя *эрганамічнасць і поліфункцыянальнасць* выкарыстаных матэрыялаў, магчымасць забеспячэння свабоднага выкарыстання такіх матэрыялаў выхаванцамі.

Разнастайнасць матэрыялаў, іх структура, размяшчэнне і выкарыстанне ў памяшканнях і на тэрыторыі ўстановы адукацыі дапамогуць выклікаць у дзіцяці станоўчыя эмоцыі, забяспечаць магчымасць яго ўдзелу як у сумеснай з выхаванцамі калектыўнай, так і ў індывідуальнай самастойнай дзейнасці.

*Гнуткасць і варыятыўнасць* развіццёвага прадметна-прасторавага асяроддзя забяспечваецца за кошт:

наяўнасці ў кожнай узроставай групе ўстановы адукацыі, а таксама на яе тэрыторыі аптымальна арганізаваных месцаў для розных відаў дзіцячай дзейнасці, мадэлявання, адасаблення, іншых мэт з выкарыстаннем

разнастайных сродкаў навучання, гульнявога і спартыўнага абсталявання (інвентару), якія забяспечваюць іх свабодны выбар выхаванцамі, у тым ліку з АПФР;

перыядычнай змяняльнасці гульнявога матэрыялу, з’яўлення новых прадметаў, якія стымулююць гульнявую, пазнавальную і даследчую актыўнасць дзяцей, іх самастойную рухальную дзейнасць.

*Трансфармуемасць і змястоўная насычанасць* развіццёвага прадметна-прасторавага асяроддзя прадугледжвае магчымасць яго змянення ў залежнасці ад арганізаванай педагагічным работнікам дзейнасці з выхаванцамі з улікам зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, тэматыкі мерапрыемстваў, інтарэсаў, узроставых і індывідуальных магчымасцей дзяцей.

Для выхаванцаў з АПФР пры стварэнні развіццёвага прадметна-прасторавага асяроддзя дадаткова неабходна забяспечваць візуалізацыю распарадку дня навучэнцаў, прасторавых зон установы адукацыі, мінімізацыю колькасці раздражняльнікаў і бар’ераў у памяшканні, карэкцыйную накіраванасць педагагічных мерапрыемстваў з выхаванцамі, у тым ліку сродкамі адаптыўнай фізічнай культуры.

Арганізацыя адукацыйнай прасторы (у будынку ўстановы адукацыі і на яе ўчастку) і разнастайнасць матэрыялаў, абсталявання і інвентару павінны забяспечваць:

магчымасць ажыццяўлення розных відаў дзіцячай дзейнасці (прадметнай, пазнавальнай практычнай, зносін, гульнявой, працоўнай і мастацкай);

рухальную актыўнасць і эмацыянальны дабрабыт выхаванцаў;

магчымасць самавыяўлення дзяцей.

Пры гэтым для кожнага выхаванца, у тым ліку з АПФР, інваліднасцю, павінна быць забяспечана *псіхалагічная камфортнасць і даступнасць* усіх памяшканняў, участкаў (пляцовак) тэрыторыі ўстановы адукацыі; усіх сродкаў навучання, гульнявога, спартыўнага абсталявання (інвентару), матэрыялаў, вучэбных выданняў і інш., якія забяспечваюць актыўны ўдзел дзяцей ва ўсіх відах дзіцячай дзейнасці.

З мэтай забеспячэння здароўезберагальнай накіраванасці адукацыйнага працэсу пры арганізацыі розных відаў дзіцячай дзейнасці неабходна прадугледзець надзейнасць і бяспечнасць выкарыстання ўсіх элементаў развіццёвага прадметна-прасторавага асяроддзя, адпаведнасць іх узроставым і псіхафізічным асаблівасцям выхаванцаў. *Звяртаем увагу*, што ў адукацыйным працэсе не павінны выкарыстоўвацца гульні (цацкі), якія:

носяць відавочны асацыяльны характар (зомбі, монстры і інш.);

зневажаюць чалавечую годнасць або абражаюць рэлігійныя пачуцці;

правакуюць дзіця на агрэсіўныя і амаральныя дзеянні, гвалт, праяўленне жорсткасці, патэнцыяльна небяспечныя ўчынкі, выклікаюць цікавасць да пытанняў, якія выходзяць за межы яго ўзроставай кампетэнцыі, фарміруюць зняважлівае і негатыўнае стаўленне да расавых асаблівасцей і фізічных недахопаў дзяцей і дарослых;

утрымліваюць грубы натуралізм, у тым ліку сексуальнага кантэксту, які выходзіць за межы ўзроставай кампетэнцыі дзіцяці;

выклікаюць нездаровую цікавасць да азартных гульняў дарослых, якая спрыяе развіццю гульнямании;

могуць прывесці да з’яўлення ў дзяцей моцнага страху, панікі і (або) спадарожных ім негатыўных псіхічных станаў (прыгнечанасці, трывожнасці, дэпрэсіі);

фарміруюць скажоныя сацыяльныя арыентацыі і ўстаноўкі і інш.

Заснавальнікі і кіраўнікі ўстаноў адукацыі павінны забяспечваць на пастаяннай аснове абнаўленне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі. З гэтай мэтай у 2023/2024 навучальным годзе неабходна працягнуць:

рэалізацыю ў поўным аб’ёме тэрытарыяльных планаў мерапрыемстваў па мадэрнізацыі ўстаноў дашкольнай адукацыі на 2021–2025 гады для напаўнення развіццёвага прадметна-прасторавага асяроддзя неабходным сучасным абсталяваннем (надворным і іншым), сродкамі навучання з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей выхаванцаў, стану іх здароўя і пазнавальных магчымасцей;

правядзенне мерапрыемстваў па стварэнні даступнага асяроддзя жыццядзейнасці ва ўстановах адукацыі з улікам комплекснага падыходу. Пры стварэнні даступнага асяроддзя трэба кіравацца Правіламі забеспячэння даступнасці для інвалідаў аб’ектаў сацыяльнай, транспартнай і вытворчай інфраструктуры, транспартных сродкаў і аказваемых паслуг, ацэнкі ўзроўню іх даступнасці, зацверджанымі пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 21 лістапада 2022 г. № 796, спецыфічнымі санітарна-эпідэміялагічнымі патрабаваннямі да ўтрымання і эксплуатацыі ўстаноў адукацыі (далей – ССЭП), зацверджанымі пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 7 жніўня 2019 г. № 525 (дадатак 3), будаўнічымі нормамі СН 3.02.12-2020 «Асяроддзе пражывання для фізічна аслабленых асоб», зацверджанымі пастановай Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь ад 13 лістапада 2020 г. № 6.

*Звяртаем увагу*, што паказчык «Забеспячэнне даступнага асяроддзя жыццядзейнасці для асоб з інваліднасцю з улікам комплекснага падыходу» з’яўляецца адным з крытэрыяў і паказчыкаў дзейнасці ўстаноў адукацыі, органаў кіравання адукацыяй, зацверджаных загадам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 25 мая 2022 г. № 370.

# УДАСКАНАЛЕННЕ ЯКАСЦІ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ, ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЯГО КАРЭКЦЫЙНАЙ НАКІРАВАНАСЦІ ПРЫ РАБОЦЕ З АСОБАМІ З АПФР

**Агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстановах адукацыі** вызначаны Кодэксам, адукацыйным стандартам дашкольнай адукацыі, вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі, тыпавым вучэбным планам дашкольнай адукацыі, тыпавым вучэбным планам спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, праграмамі спецыяльнай адукацыі.

Пры гэтым адукацыйны працэс трэба арганізоўваць такім чынам, каб захаваць самабытнасць і спецыфіку дашкольнага дзяцінства. Асновай навучання і выхавання з'яўляецца разнастайная дзейнасць дзяцей, адпаведная іх узроставым і індывідуальным магчымасцям.

Развіццёвае індывідуальна арыентаванае навучанне можа праводзіцца франтальна ці па падгрупах з улікам індывідуальнасці кожнага дзіцяці (наяўнасць досведу, магчымасцей, тэмпу, асобасных асаблівасцей і да т. п.).

На карэкцыйных занятках, якія могуць арганізоўвацца з групай, па падгрупах або індывідуальна, праводзіцца карэкцыя парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці дзіцяці з АПФР.

У пачатку і канцы тыдня павінны прадугледжвацца заняткі, аблегчаныя па змесце і разумовай нагрузцы.

Дамашнія заданні ва ўсіх узроставых групах задавацца не павінны.

Забараняецца праводзіць заняткі ў прыёмных-раздзявальнях, спальнях, абсталяваных стацыянарнымі ложкамі.

Падчас канікул з выхаванцамі праводзяцца мерапрыемствы фізкультурна-аздараўленчай і мастацка-эстэтычнай накіраванасці.

Асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу ў летні перыяд адлюстраваны ў інструктыўна-метадычным пісьме Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Аб арганізацыі дзейнасці ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю, у летні перыяд» (*https://edu.gov.by/urovni-obrazovaniya/doshkolnoe-obrazovanie/doshkolnoe-obrazovanie/informatsiya/nauchno-metodicheskoe-obespechenie*).

## Мова навучання і выхавання

Выбар мовы навучання і выхавання пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з

артыкулам 82 Кодэкса.

Навучанне і выхаванне пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ажыццяўляецца на адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь. Мова навучання і выхавання вызначаецца заснавальнікам установы адукацыі з улікам пажаданняў законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў пры наяўнасці такой магчымасці.

Права грамадзян на выбар навучання і выхавання на адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь забяспечваецца развіццём сеткі ўстаноў адукацыі, груп з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання, выпускам вучэбных выданняў на беларускай і рускай мовах.

Згодна з артыкулам 21 Закона Рэспублікі Беларусь ад 26 студзеня 1990 г. № 3094-XI «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» кіраўнікі і педагагічныя работнікі сістэмы адукацыі павінны валодаць беларускай і рускай мовамі.

З улікам пажаданняў законных прадстаўнікоў выхаванцаў установы адукацыі фарміруюць групы, якія арганізуюць адукацыйны працэс як на рускай, так і на беларускай мовах. Пры камплектаванні груп трэба максімальна ўлічваць пажаданні законных прадстаўнікоў выхаванцаў адносна выбару мовы навучання (беларуская, руская), магчымасць далейшага атрымання адукацыі на беларускай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

З мэтай стварэння максімальна спрыяльных умоў для развіцця маўленчых навыкаў, далучэння выхаванцаў да беларускай нацыянальнай культуры, паспяховасці фарміравання двухмоўя павінна ствaрацца камунікатыўнае асяроддзе, якое забяспечвае ўключэнне дзвюх моў у разнастайныя віды дзіцячай дзейнасці, а таксама правядзенне спецыяльна арганізаваных форм адукацыйнага працэсу ў адпаведнасці са зместам вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі. Варта звярнуць увагу на стварэнне адпаведнага развіццёвага прадметна-прасторавага асяроддзя, павышэнне прафесійнага ўзроўню педагагічных работнікаў у пытаннях лінгвістычнага і маўленчага развіцця выхаванцаў ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўя.

Адукацыйны працэс у групах з беларускай мовай навучання арганізуецца на беларускай мове. Выключэнне складаюць гадзіны, адведзеныя на вывучэнне адукацыйнай галіны «Развитие речи и культура речевого общения» вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі («Развитие речи» тыпавога вучэбнага плана спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі).

У адпаведнасці з пажаданнямі законных прадстаўнікоў выхаванцаў па рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, узгодненым з Міністэрствам адукацыі, могуць ствaрацца групы ва ўстановах адукацыі, у якіх выхаванцы вывучаюць мову нацыянальнай меншасці.

## Навукова-метадычнае забеспячэнне дашкольнай адукацыі, спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі

У адпаведнасці з артыкулам 143 Кодэкса **тыпавы вучэбны план дашкольнай адукацыі** (*https://edu.gov.by/urovni-obrazovaniya/doshkolnoe-obrazovanie/doshkolnoe-obrazovanie/informatsiya/nauchno-metodicheskoe-obespechenie*) з’яўляецца кампанентам вучэбна-праграмнай дакументацыі і асновай для распрацоўкі вучэбных планаў устаноў адукацыі.

Пры складанні вучэбнага плана ўстановы адукацыі неабходна ўлічваць наяўнасць ва ўстанове адукацыі спецыяльных груп, груп інтэграванага навучання і выхавання, санаторных спецыяльных груп, санаторных груп інтэграванага навучання і выхавання.

Пры наяўнасці ва ўстанове адукацыі спецыяльнай групы, санаторнай спецыяльнай групы вучэбны план установы адукацыі дапаўняецца пералікам адукацыйных галін, карэкцыйных заняткаў з улікам тыпавога вучэбнага плана спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, а таксама структуры і ступені цяжкасці парушэнняў выхаванцаў.

Пры наяўнасці ва ўстанове адукацыі групы інтэграванага навучання і выхавання, санаторнай групы інтэграванага навучання і выхавання на бягучы навучальны год распрацоўваецца вучэбны план інтэграванага навучання і выхавання на ўзроўні дашкольнай адукацыі, які з’яўляецца дадаткам да вучэбнага плана ўстановы адукацыі. У вучэбным плане ўстановы адукацыі групы інтэграванага навучання і выхавання, санаторныя групы інтэграванага навучання і выхавання адзначаюцца сімвалам «*».

На аснове тыпавога вучэбнага плана дашкольнай адукацыі, індывідуальнай вучэбнай праграмы для выхаванца з асаблівымі індывідуальнымі адукацыйнымі патрэбамі ўстановай адукацыі распрацоўваецца **індывідуальны вучэбны план**, які зацвярджаецца кіраўніком установы адукацыі і ўстанаўлівае асаблівасці атрымання дашкольнай адукацыі выхаванцамі з улікам іх магчымасцей, здольнасцей і патрэб, а таксама выхаванцамі, час знаходжання якіх ва ўстанове адукацыі зменшаны па жаданні іх законных прадстаўнікоў.

**Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі** (*https://edu.gov.by/urovni-obrazovaniya/doshkolnoe-obrazovanie/doshkolnoe-obrazovanie/informatsiya/nauchno-metodicheskoe-obespechenie*), распрацаваная з улікам патрабаванняў адукацыйнага стандарту дашкольнай адукацыі, вызначае мэты і задачы вывучэння адукацыйных галін, іх змест, віды вучэбнай дзейнасці, рэкамендаваныя формы і метады навучання і выхавання.

Мэтай вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі з’яўляецца рознабаковае развіццё асобы выхаванца ранняга і дашкольнага ўзросту ў адпаведнасці з яго ўзроставымі і індывідуальнымі магчымасцямі,

здольнасцямі і патрэбамі, фарміраванне ў яго маральных норм, кампетэнцый, неабходных для набыцця сацыяльнага досведу, падрыхтоўкі да працягу адукацыі.

Змест вучэбнай праграмы рэалізуецца ў спецыяльна арганізаванай і нерэгламентаванай дзейнасці выхаванцаў.

Максімальны дапушчальны аб'ём вучэбнай нагрузкі на выхаванцаў ранняга і дашкольнага ўзросту пры правядзенні спецыяльна арганізаваных форм адукацыйнага працэсу – гульняў (заняткаў), рэгламентаваных тыпавым вучэбным планам дашкольнай адукацыі, тыпавым вучэбным планам спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, колькасць і віды заняткаў, іх працягласць і месца ў распарадку дня павінны вызначацца педагагічным работнікам у адпаведнасці з вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі, праграмамі спецыяльнай адукацыі, вучэбным планам установы адукацыі, распрацаваным і зацверджаным ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку, з улікам стану здароўя выхаванцаў, іх індывідуальных магчымасцей, здольнасцей і патрэб.

Нерэгламентаваная дзейнасць выхаванцаў, якая рэалізуецца ва ўмовах спецыяльна створанага развіццёвага прадметна-прасторавага асяроддзя, таксама накіравана на вырашэнне адукацыйных задач, забяспечвае выбар кожным дзіцем дзейнасці па інтарэсах і дазваляе яму ўзаемадзейнічаць з аднагодкамі, дарослымі або дзейнічаць індывідуальна.

*Звяртаем увагу*, што спецыяльна арганізаваная дзейнасць і нерэгламентаваная дзейнасць на працягу дня з размеркаваннем часу на аснове рэкамендацый органаў і ўстаноў, якія ажыццяўляюць дзяржаўны санітарны нагляд, з'яўляюцца ўзаемадапаўняльнымі.

З мэтай стварэння аптымальных умоў для навучання і выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага (беларуска-рускага) білінгвізму тыпавым вучэбным планам дашкольнай адукацыі, тыпавым вучэбным планам спецыяльнай адукацыі прадугледжана засваенне дзвюх дзяржаўных моў як у спецыяльна арганізаванай, так і нерэгламентаванай дзейнасці.

На аснове вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі ўстановай адукацыі распрацоўваецца **індывідуальная вучэбная праграма для выхаванца з асаблівымі індывідуальнымі адукацыйнымі патрэбамі**, якая зацвярджаецца кіраўніком установы адукацыі і вызначае мэты і задачы вывучэння адукацыйных галін, іх змест, час на вывучэнне асобных тэм, віды вучэбнай дзейнасці, рэкамендаваныя формы і метады навучання і выхавання дзяцей з асаблівымі індывідуальнымі адукацыйнымі патрэбамі.

Адукацыйны працэс ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, ажыццяўляецца з выкарыстаннем **тыпавога вучэбнага плана спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, вучэбнага**

**плана ЦКРНіР для выхаванцаў з цяжкімі, множнымі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці**, зацверджаных пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 24 жніўня 2022 г. № 286.

Тыпавы вучэбны план спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі ўстанаўлівае пералік адукацыйных галін, колькасць вучэбных гадзін на іх вывучэнне па групах выхаванцаў, колькасць вучэбных гадзін на правядзенне карэкцыйных заняткаў, максімальны дапушчальны аб'ём вучэбнай нагрузкі і агульную колькасць вучэбных гадзін на тыдзень.

Пералік адукацыйных галін і колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне іх у тыпавым вучэбным плане спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі вызначаюцца ў залежнасці ад магчымасцей засваення зместу адукацыйных галін асобнымі катэгорыямі выхаванцаў з АПФР і могуць не супадаць з пералікам адукацыйных галін і колькасцю вучэбных гадзін на іх вывучэнне, вызначанымі тыпавым вучэбным планам дашкольнай адукацыі.

Пералік карэкцыйных заняткаў у тыпавым вучэбным плане спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі ўключае карэкцыйныя заняткі для розных катэгорый выхаванцаў з АПФР. Вучэбныя гадзіны, вызначаныя на правядзенне карэкцыйных заняткаў, не ўлічваюцца ў максімальную дапушчальную вучэбную нагрузку на тыдзень на аднаго выхаванца.

На аснове тыпавога вучэбнага плана спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, праграм спецыяльнай адукацыі распрацоўваецца вучэбны план спецыяльнага дзіцячага сада, іншай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, якія ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, рэалізуюць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, на бягучы навучальны год, які зацвярджаецца кіраўніком спецыяльнага дзіцячага сада, іншай арганізацыі, індывідуальным прадпрымальнікам, якія ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць (далей – вучэбны план спецыяльнага дзіцячага сада).

Выбар карэкцыйных заняткаў для ўключэння ў вучэбны план спецыяльнага дзіцячага сада ажыццяўляецца з улікам рэкамендацый ЦКРНіР.

Вучэбны план ЦКРНіР для выхаванцаў з цяжкімі, множнымі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці ўключае ў сябе пералік адукацыйных галін, якія змяшчаюць асновы ведаў аб навакольным свеце, даступныя для засваення названымі асобамі, а таксама забяспечваюць набыццё імі навыкаў самаабслугоўвання. Вучэбныя гадзіны, прадугледжаныя вучэбным планам ЦКРНіР для выхаванцаў з цяжкімі, множнымі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці, вызначаныя

на правядзенне карэкцыйных заняткаў, не ўлічваюцца ў максімальным дапушчальным аб’ёме вучэбнай нагрузкі на тыдзень на аднаго выхаванца.

На аснове вучэбнага плана ЦКРНіР для выхаванцаў з цяжкімі, множнымі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці ЦКРНіР распрацоўваюць вучэбны план на бягучы навучальны год.

Змест адукацыйных галін тыпавога вучэбнага плана спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, вучэбнага плана ЦКРНіР для выхаванцаў з цяжкімі, множнымі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці вызначаецца праграмамі спецыяльнай адукацыі.

Разам з адпаведнымі праграмамі спецыяльнай адукацыі для дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні, з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату рэкамендуецца выкарыстоўваць вучэбную праграму дашкольнай адукацыі. Спецыфіка яе рэалізацыі для дзяцей гэтых катэгорый вызначаецца ўмовамі, выбарам сродкаў, форм, метадаў, спецыяльных прыёмаў навучання; арганізацыяй адаптыўнага адукацыйнага асяроддзя з улікам патрэб выхаванцаў.

Адукацыйны працэс з дзецьмі з парушэннямі зроку ва ўстановах адукацыі рэкамендуецца ажыццяўляць у адпаведнасці з адаптаваным зместам вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі для дзяцей з парушэннямі зроку. Пры гэтым назвы і структуру раздзелаў, змест вучэбнага матэрыялу неабходна суадносіць з вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі.

Электронныя версіі праграм спецыяльнай адукацыі, адаптаванага зместу вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі для дзяцей з парушэннямі зроку размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале https://adu.by ў раздзеле «Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Спецыяльная адукацыя» (*https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/spetsialnoe-obrazovanie.html*).

Карэкцыйныя заняткі праводзіць настаўнік-дэфектолаг. Выбар напрамку, колькасці і формы правядзення карэкцыйных заняткаў (індывідуальная, падгрупавая або групавая) ажыццяўляецца на падставе заключэння ЦКРНіР.

Тыпавым вучэбным планам спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі пры рэалізацыі зместу адукацыйных галін «Развіццё маўлення» і «Развитие речи» прадугледжана:

засваенне адной з названых адукацыйных галін у рабоце з дзецьмі з парушэннем слыху, цяжкімі парушэннямі маўлення, інтэлектуальнай недастатковасцю, расстройствамі аўтыстычнага спектра ў залежнасці ад выбару мовы навучання і выхавання законнымі прадстаўнікамі выхаванцаў;

засваенне дзвюх дзяржаўных моў адначасова пачынаючы з другога паўгоддзя ў другой малодшай групе (ад 3 да 4 гадоў) у рабоце з дзецьмі з

парушэннямі зроку, з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату, цяжкасцямі ў навучанні.

*Звяртаем увагу*, што ў нерэгламентаванай дзейнасці на працягу дня магчыма выкарыстанне дзвюх моў незалежна ад катэгорыі выхаванцаў з АПФР (гульні, заданні, літаратурныя і музычныя творы і да т. п.).

## Вучэбныя выданні і сродкі навучання

Да выкарыстання ў адукацыйным працэсе дапускаюцца вучэбныя дапаможнікі і іншыя вучэбныя выданні, афіцыйна зацверджаныя або дапушчаныя ў якасці адпаведнага віду вучэбнага выдання Міністэрствам адукацыі, вучэбныя выданні (акрамя вучэбных дапаможнікаў), рэкамендаваныя арганізацыямі, якія ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі (далей – вучэбныя выданні).

Ва ўстанове адукацыі павінны выкарыстоўвацца сродкі навучання (гульні і цацкі, электронныя сродкі навучання і інш.), выраблены ў адпаведнасці з тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі і дазволеныя да ўжывання заканадаўствам.

Ва ўстанове адукацыі (метадычным кабінеце, групавых памяшканнях, кабінетах музычных кіраўнікоў, кіраўнікоў фізічнага выхавання, настаўнікаў-дэфектолагаў, педагогаў-псіхолагаў і інш.) вядзецца анатаваны ўлік забяспечанасці вучэбнымі выданнямі.

Пералік вучэбных выданняў па дашкольнай і спецыяльнай адукацыі штогод абнаўляецца і размяшчаецца на Інтэрнэт-партале Міністэрства адукацыі (*https://edu.gov.by*), нацыянальным адукацыйным партале (*https://adu.by / Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Спецыяльная адукацыя*; *https://adu.by / Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Дашкольная адукацыя*); публікуецца ў бюлетэні «Зборнік нарматыўных дакументаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь».

У адпаведнасці з артыкулам 39 Кодэкса карыстанне вучэбнымі дапаможнікамі навучэнцамі ва ўстановах адукацыі можа быць платным і бясплатным. Асобы, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, у тым ліку асобы з АПФР, якія атрымліваюць карэкцыйна-педагагічную дапамогу ў пунктах карэкцыйна-педагагічнай дапамогі ўстаноў адукацыі, на час атрымання адукацыі забяспечваюцца вучэбнымі дапаможнікамі ўстановамі адукацыі, якія ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць, за плату.

Кодэксам прадугледжаны дыферэнцаваныя льготы для асобных катэгорый грамадзян пры аплаце за карыстанне вучэбнымі дапаможнікамі (зніжэнне на 50 працэнтаў або вызваленне ад аплаты) ва ўстановах адукацыі.

Бясплатнае карыстанне вучэбнымі дапаможнікамі ўстаноўлена для выхаванцаў з АПФР, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, дзяцей-інвалідаў.

Міністрам адукацыі 3 лютага 2023 г. зацверджаны «Пералік вучэбных выданняў для выкарыстання ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, у якасці вучэбных дапаможнікаў для выхаванцаў старшых груп (ад 5 да 7 гадоў) у 2023/2024 навучальным годзе» (размешчаны на Інтэрнэт-партале Міністэрства адукацыі https://edu.gov.by/urovni-obrazovaniya/doshkolnoe-obrazovanie/doshkolnoe-obrazovanie/informatsiya/nauchno-metodicheskoe-obespechenie, нацыянальным адукацыйным партале https://adu.by / *Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Дашкольная адукацыя*).

У 2023/2024 навучальным годзе ў якасці вучэбных дапаможнікаў будуць выкарыстоўвацца наступныя вучэбныя выданні.

1. Давидович, А. Л. Путешествие в мир правильной речи. Рабочая тетрадь : учебное пособие для воспитанников старших групп (от 5 до 7 лет) учреждений дошкольного образования с русским языком обучения / А. Л. Давидович, В. Л. Пашко. – Минск : Национальный институт образования, 2020–2023. – 76 с. : ил. – *(УМК «Мои первые уроки»)*.

2. Давидович, А. Л. Путешествие в мир правильной речи. Шаг за шагом. Рабочая тетрадь : учебное пособие для воспитанников старших групп (от 5 до 7 лет) учреждений дошкольного образования с белорусским языком обучения / А. Л. Давидович, В. Л. Пашко. – Минск : Национальный институт образования, 2020–2023. – 76 с. : ил. – *(УМК «Мои первые уроки»)*.

3. Давідовіч, А. Л. Свет, у якім я жыву. Рабочы сшытак / Мир, в котором я живу. Рабочая тетрадь : вучэбны дапаможнік для выхаванцаў старшых груп (ад 5 да 7 гадоў) устаноў дашкольнай адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / А. Л. Давідовіч, А. І. Смолер. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020–2023. – 80 с. : іл. – *(ВМК «Мае першыя ўрокі»)*.

4. Дубініна, Д. М. Родная мова. Рабочы сшытак : вучэбны дапаможнік для выхаванцаў старшых груп (ад 5 да 7 гадоў) устаноў дашкольнай адукацыі з беларускай мовай навучання / Д. М. Дубініна, Н. С. Старжынская. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020–2023. – 80 с. : іл. – *(ВМК «Мае першыя ўрокі»)*.

5. Дубініна, Д. М. Родная мова. Крок за крокам. Рабочы сшытак : вучэбны дапаможнік для выхаванцаў старшых груп (ад 5 да 7 гадоў) устаноў дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання / Д. М. Дубініна, Н. С. Старжынская. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020–2023. – 80 с. : іл. – *(ВМК «Мае першыя ўрокі»)*.

6. Жытко, І. У. Матэматычны калейдаскоп. Рабочы сшытак / Математический калейдоскоп. Рабочая тетрадь : вучэбны дапаможнік для выхаванцаў старшых груп (ад 5 да 7 гадоў) устаноў дашкольнай адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / І. У. Жытко. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020–2023. – 76 с. : іл. – *(ВМК «Мае першыя ўрокі»)*.

7. Старжинская, Н. С. Подготовка к обучению грамоте. Рабочая тетрадь : учебное пособие для воспитанников старших групп (от 5 до 7 лет) учреждений дошкольного образования с русским языком обучения / Н. С. Старжинская. – Минск : Национальный институт образования, 2020–2023. – 80 с. : ил. – *(УМК «Мои первые уроки»)*.

8. Старжынская, Н. С. Падрыхтоўка да навучання грамаце. Рабочы сшытак : вучэбны дапаможнік для выхаванцаў старшых груп (ад 5 да 7 гадоў) устаноў дашкольнай адукацыі з беларускай мовай навучання / Н. С. Старжынская. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020–2023. – 80 с.: іл. – *(ВМК «Мае першыя ўрокі»)*.

*Звяртаем увагу*, што ў вучэбных дапаможніках ВМК «Мае першыя ўрокі» прадстаўлены змест як для выхаванцаў старшых груп ад 5 да 6 гадоў, так і для выхаванцаў старшых груп ад 6 да 7 гадоў. У сувязі з гэтым выдача другога камплекта вучэбных дапаможнікаў выхаванцам старшай групы ад 6 да 7 гадоў на другім годзе навучання не прадугледжана – выкарыстоўваюцца раней набытыя вучэбныя дапаможнікі.

Кіраўнікам устаноў адукацыі неабходна звярнуць асаблівую ўвагу *на своечасовасць* (да 15 жніўня) прадастаўлення законнымі прадстаўнікамі выхаванцаў, якія маюць права на бясплатнае карыстанне вучэбнымі дапаможнікамі або зніжэнне платы за карыстанне імі, адпаведных дакументаў.

Пры адлічэнні з установы адукацыі выхаванцаў, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, па ініцыятыве законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца, які жадае атрымаць дашкольную адукацыю, спецыяльную адукацыю ў іншай установе адукацыі, вучэбныя дапаможнікі перадаюцца яго законнаму прадстаўніку.

## ВЫХАВАЎЧАЯ РАБОТА ВА ЎСТАНОВЕ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

У адпаведнасці з Кодэксам выхаванне навучэнцаў грунтуецца на агульначалавечых, гуманістычных каштоўнасцях, культурных і духоўных традыцыях беларускага народа, дзяржаўнай ідэалогіі, адлюстроўвае інтарэсы асобы, грамадства і дзяржавы, што і вызначае прыярытэты яго ажыццяўлення. Асноўныя напрамкі выхаваўчай работы вызначаны ў

Канцэпцыі бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі (пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2015 г. № 82); Праграме бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі на 2021–2025 гг. (пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2020 г. № 312); Праграме патрыятычнага выхавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2022–2025 гады (пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2021 г. № 773) і іншых нарматыўных прававых актах.

Выхаваўчая работа павінна ажыццяўляцца ў адпаведнасці з асноўнымі складнікамі выхавання, прадстаўленымі ў адукацыйным стандарце дашкольнай адукацыі, у працэсе рэалізацыі зместу вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі, праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі ў кожнай узроставай групе выхаванцаў як у спецыяльна арганізаванай, так і ў нерэгламентаванай дзейнасці. Выхаваўчую работу ў межах сваіх службовых абавязкаў ажыццяўляюць усе педагагічныя работнікі ўстаноў адукацыі.

Пры planаванні работы мэтазгодна забяспечыць інтэграцыю задач розных складнікаў выхавання, пераемнасць у рабоце ўсіх спецыялістаў у гэтым напрамку. Мерапрыемствы выхаваўчай работы павінны прадугледжваць магчымасць роўнага доступу для ўсіх выхаванцаў з улікам разнастайнасці асаблівых індывідуальных адукацыйных патрэб і індывідуальных магчымасцей кожнага дзіцяці на аснове забеспячэння прынцыпу інклюзіі ў адукацыі.

З мэтай кансалідацыі беларускага народа, умацавання ў грамадстве ідэй міру і стваральнай працы як галоўных умоў развіцця беларускай дзяржавы 2023 год праходзіць пад знакам Года міру і стварэння.

З улікам тэматыкі года асаблівая ўвага ў межах адукацыйнага працэсу ва ўстановах адукацыі і ва ўмовах сям'і павінна надавацца:

грамадзянскаму і патрыятычнаму выхаванню (набыццю выхаванцамі першапачатковых ведаў аб сваёй сям'і, родным краі, краіне, дзяржаўных сімвалах, вядомых людзях, выхаванню паважлівага стаўлення да гераічнага мінулага свайго народа, каштоўнасных адносін да жыцця і міру, павагі да абаронцаў Айчыны, да памяці загінуўшых воінаў, пачуцця гонару за дасягненні сваёй краіны (напрыклад, спартыўныя, культурныя));

ідэалагічнаму выхаванню (фарміраванню ў выхаванцаў першасных уяўленняў аб асновах дзяржаўнай ідэалогіі, прывіццю ім агульначалавечых, гуманістычных каштоўнасцей, ідэй, перакананняў, якія адлюстроўваюць сутнасць беларускай дзяржаўнасці, і інш.);

духоўна-маральнаму выхаванню (фарміраванню ў дзяцей асноў маральных уяўленняў, назапашванню досведу маральных паводзін, абагачэнню эмацыянальнай сферы з дапамогай засваення маральна-этычных норм (дабрыня, сяброўства, ветлівасць, любоў, сумленнасць,

узаемадапамога), далучэнню да агульначалавечых і гуманістычных каштоўнасцей і інш.);

сямейнаму і гендарнаму выхаванню (фарміраванню ў выхаванцаў першапачатковых уяўленняў аб сям’і ў адпаведнасці з традыцыйнымі каштоўнасцямі беларускага грамадства, блізкіх людзях, іх узаемаадносінах і інш.);

працоўнаму і прафесійнаму выхаванню (засваенню дзецьмі асноўных бытавых уменняў і навыкаў, праяўленню актыўнасці ў побыце, самаабслугоўванні, доглядзе раслін і жывёл, клопаце аб блізкіх і інш.);

выхаванню культуры побыту і вольнага часу (фарміраванню ў выхаванцаў першасных уяўленняў аб асабістай і грамадскай значнасці гаспадарча-бытавой працы, уменняў утрымліваць свой пакой, рэчы, цацкі ў парадку, сумесна з дарослымі гатаваць нескладаныя стравы, сервіраваць стол і інш.);

эканамічнаму выхаванню (выхаванню ў дзяцей працавітасці сродкамі гульнявой дзейнасці і абслуговай працы, знаёмству з элементамі эканамічнай адукаванасці і інш.) і інш.

З мэтай павышэння ўзроўню адказнасці за мірную і незалежную сучаснасць і будучыню краіны, прасоўванне мірных ініцыятыў і папулярызацыю стваральных каштоўнасцей варта ўжываць розныя формы арганізацыі выхаванцаў у адукацыйным працэсе (заняткі, гульні, экскурсіі, адукацыйныя праекты і інш.), метады і прыёмы (гутаркі, чытанне твораў мастацкай літаратуры і інш.), якія забяспечваюць фарміраванне:

павагі і талерантнага стаўлення да прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, бежанцаў, якія жывуць у Рэспубліцы Беларусь, іх культуры і традыцый;

уяўленняў аб іншых краінах і народах, іх разнастайнасці, асаблівасці іх культуры, нормах паводзін у розных культурах; павагі да нацыянальных культур іншых людзей, міралюбнасці;

усведамлення таго, што ўсе людзі на Зямлі – адна вялікая сям’я, а сама Зямля – наш агульны дом;

усведамлення агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей;

цікавасці да працы дарослых і іх прафесій, да роднага краю, нацыянальнай культуры;

усведамлення сваёй прыналежнасці да сям’і, малой радзімы, краіны;

уяўленняў аб людзях, якія праславілі Беларусь, іх дзейнасці і дасягненнях і інш.

З мэтай папулярызацыі і павышэння прэстыжу рабочых прафесій у межах ранняй прафесійнай арыентацыі дзяцей дашкольнага ўзросту выдавецтвам «Адукацыя і выхаванне» па даручэнні Міністэрства адукацыі падрыхтавана серыя выданняў «Славим Родину трудом» (аўтары –

С. А. Штабінская, Н. А  Паддубская). Выданні серыі («Кто нам строит новый дом?», «Кто нам шьет одежду?», «Кто нас учит?», «Кто выращивает цветы?», «Кто еду готовит нам?», «Кто чинит автомобили?») могуць быць выкарыстаны педагагічнымі работнікамі ў адукацыйным працэсе ўстаноў адукацыі ў спецыяльна арганізаванай (гульня, заняткі) і нерэгламентаванай дзейнасці выхаванцаў, а таксама бацькамі (законнымі прадстаўнікамі) выхаванцаў ва ўмовах сямейнага выхавання.

*Звяртаем увагу*, што забяспечыць у поўнай меры сфарміраванасць названых і іншых уяўленняў у дзяцей дашкольнага ўзросту магчыма пры ўмове цеснага супрацоўніцтва педагагічных работнікаў установы адукацыі, бацькоў (законных прадстаўнікоў) выхаванцаў, іншых зацікаўленых. На яркіх прыкладах свайго жыцця, працы, стаўлення да дзяржавы дарослыя дэманструюць дзіцяці, што на яго ўскладаюць надзеі не толькі родныя, але і грамадства ў цэлым.

Формамі ўзаемадзеяння ўстановы адукацыі і сям’і могуць быць правядзенне кансультацый па пытаннях духоўна-маральнага і эканамічнага выхавання, выхавання культуры побыту і вольнага часу; арганізацыя сумесных забаў, свят, экскурсій, у тым ліку па гістарычных мясцінах Беларусі, акцый, конкурсаў, квестаў, інтэрактыўных пляцовак, акцый і суботнікаў па навядзенні парадку і добраўпарадкаванні тэрыторый устаноў адукацыі, населеных пунктаў, гістарычных, памятных месцаў, азеляненні тэрыторыі; рэалізацыя адукацыйных праектаў і іншых мерапрыемстваў, на якіх выхаванцы і іх бацькі (законныя прадстаўнікі) змогуць разам працаваць, камунікаваць, дзяліцца ўражаннямі, расказваць аб сваёй сям’і, доме, сямейных традыцыях, радаводзе, сумесным адпачынку, занятках і прафесіях членаў сям’і і інш.

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 1 лютага 2023 г. № 93 зацверджаны план мерапрыемстваў па правядзенні ў 2023 Года міру і стварэння.

У межах выканання мерапрыемстваў плана неабходна арганізаваць і правесці ва ўстановах адукацыі Дзень ведаў на тэму «Мір і стварэнне – сувязь часоў і пакаленняў», урачыстыя лінейкі з абавязковым праслухоўваннем (выкананнем) Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь, узняццем (вынасам) Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі ўстановы адукацыі (на пляцоўцы з устаноўленым флагштокам).

Пры арганізацыі сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы ва ўстановах адукацыі неабходна забяспечыць выкарыстанне афіцыйных крыніц прававой інфармацыі. У складзе інфармацыйна-пошукавых сістэм (далей – ІПС) «ЭТАЛОН» і «ЭТАЛОН-ONLINE» (*www.etalonline.by*) функцыянуюць і пастаянна абнаўляюцца наступныя тэматычныя банкі даных (далей – БД):

БД «Правы непаўналетніх», у які ўключаны дакументы, што тычацца прававога становішча дзяцей, атрымання імі адукацыі, ажыццяўлення працоўнай дзейнасці, пытанняў, звязаных з прафілактыкай безнагляднасці непаўналетніх, іх адказнасці, а таксама прававыя акты па процідзеянні гандлю людзьмі;

БД «Прававыя асновы дзяржаўнай ідэалогіі», у якім сістэматызаваны дакументы, што датычацца канстытуцыйных асноў дзяржаўнага ладу, дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў, дзяржаўнай інфармацыйнай, сацыяльнай і маладзёжнай палітыкі і інш.

Таксама з мэтай выхавання правасвядомасці ў дзяцей і падлеткаў створаны і функцыянуе Дзіцячы прававы сайт *(www.mir.pravo.by)*. Гэта рэсурс, які дапамагае навучэнцам зразумець, што такое права, і атрымаць першапачатковыя юрыдычныя веды, расказвае аб заканадаўстве Рэспублікі Беларусь і правах грамадзян нашай краіны. Інфармацыя падаецца ў займальнай і даступнай форме, у тым ліку праз гульнявыя сітуацыі, вырашэнне якіх спрыяе набыццю дзіцем навыкаў правамерных паводзін.

## Арганізацыя фізічнага выхавання

З мэтай забеспячэння бяспекі выхаванцаў фізічнае выхаванне ва ўстанове адукацыі павінна быць арганізавана строга ў адпаведнасці з Санітарнымі нормамі і правіламі «Патрабаванні для ўстаноў дашкольнай адукацыі» (пастанова Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 25 студзеня 2013 г. № 8), ССЭП, зацверджанымі пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 7 жніўня 2019 г. № 525, Правіламі, Інструкцыяй аб парадку арганізацыі і кадравым забеспячэнні фізічнага выхавання навучэнцаў, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 14 чэрвеня 2018 г. № 55 (у рэдакцыі пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 1 сакавіка 2023 г. № 61) (далей – Інструкцыя), іншымі нарматыўнымі прававымі актамі.

Гатоўнасць будынкаў, збудаванняў, тэрыторыі, іншых аб'ектаў, у тым ліку надворнага і іншага абсталявання, павінна быць адлюстравана ў акце аб стане спраў і неабходных мерапрыемствах па падрыхтоўцы ўстановы адукацыі да арганізацыі адукацыйнага працэсу (загад Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 20 красавіка 2021 г. № 288 «Аб асобных пытаннях арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстановах дашкольнай адукацыі»). Пры гэтым усе прадпісанні і рэкамендацыі органаў дзяржаўнага пажарнага нагляду, устаноў, якія ажыццяўляюць дзяржаўны санітарны нагляд, упраўленняў (аддзелаў) унутраных спраў гарадскога (раённага) выканаўчага камітэта (мясцовай адміністрацыі) павінны быць выкананы.

*Звяртаем увагу*, што згодна з АКДПС кіраўнік фізічнага выхавання нясе адказнасць за жыццё і здароўе навучэнцаў падчас фізкультурна-

аздараўленчых і спартыўна-масавых мерапрыемстваў, забяспечвае строгае выкананне патрабаванняў да мер бяспекі пры арганізацыі адукацыйнага працэсу, пры правядзенні заняткаў па фізічнай культуры, фізкультурна-аздараўленчых і спартыўна-масавых мерапрыемстваў.

Фізічнае выхаванне навучэнцаў ажыццяўляецца ў працэсе разнастайных відаў дзейнасці ў адпаведнасці з вучэбна-праграмнай дакументацыяй адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю (вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі, тыпавым вучэбным планам дашкольнай адукацыі, праграмамі спецыяльнай адукацыі, тыпавым вучэбным планам спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, вучэбным планам ЦКРНіР для выхаванцаў з цяжкімі, множнымі парушэннямі ў фізічным і (або) псіхічным развіцці) на занятках па адукацыйнай галіне «Фізічная культура» («Адаптыўная фізічная культура»), у іншых формах (ранішняя гімнастыка; індывідуальна-дыферэнцаваныя заняткі; рухомыя гульні і фізічныя практыкаванні на прагулцы; фізкультурны вольны час і святы, дні здароўя; самастойная рухальная дзейнасць) з улікам узросту, полу, фізічнай падрыхтаванасці, індывідуальных псіхафізічных асаблівасцей і стану здароўя выхаванцаў.

У перыяд канікул пры атрыманні дашкольнай адукацыі, спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі з выхаванцамі праводзяцца мерапрыемствы фізкультурна-аздараўленчай накіраванасці.

Згодна з абзацам другім пункта 3 Інструкцыі да заняткаў па адукацыйнай галіне «Фізічная культура» («Адаптыўная фізічная культура») да ўдзелу ў фізкультурна-аздараўленчых, спартыўна-масавых мерапрыемствах не павінны дапускацца выхаванцы, якія не прайшлі медыцынскае абследаванне.

Заняткі па адукацыйнай галіне «Фізічная культура» («Адаптыўная фізічная культура»), фізкультурна-аздараўленчыя мерапрыемствы пры атрыманні дашкольнай адукацыі, спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі праводзяцца выхавацелем дашкольнай адукацыі, кіраўніком фізічнага выхавання, інструктарам па лячэбнай фізкультуры.

З мэтай забеспячэння бяспекі жыццядзейнасці навучэнцаў пры арганізацыі і правядзенні заняткаў па адукацыйнай галіне «Фізічная культура» («Адаптыўная фізічная культура») на падставе палажэнняў Інструкцыі аб парадку размеркавання навучэнцаў у асноўную, падрыхтоўчую, спецыяльную медыцынскую групу, групу лячэбнай фізкультуры (пастанова Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 9 чэрвеня 2014 г. № 38) яны размяркоўваюцца ў адпаведныя групы з улікам

стану здароўя, наяўнасці або адсутнасці захворванняў, ацэнкі фізічнага, нервова-псіхічнага развіцця, функцыянальнага стану арганізма.

Педагагічнымі работнікамі заняткі з навучэнцамі асноўнай групы праводзяцца сумесна з навучэнцамі падрыхтоўчай групы на падставе рэкамендацый урача-педыятра (урача агульнай практыкі).

Заняткі з навучэнцамі спецыяльнай медыцынскай групы павінны праводзіцца асобна ад асноўнай групы педагагічнымі работнікамі, якія прайшлі спецыяльную падрыхтоўку.

Медыцынскім работнікам (інструктарам па лячэбнай фізкультуры), які прайшоў падрыхтоўку па лячэбнай фізічнай культуры, праводзяцца заняткі з навучэнцамі, накіраванымі ў групу лячэбнай фізічнай культуры, у абсталяваных для гэтых мэт памяшканнях установы адукацыі.

Тыпавым вучэбным планам дашкольнай адукацыі, тыпавым вучэбным планам спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі прадугледжана ад 1 да 3 вучэбных гадзін на тыдзень на рэалізацыю зместу адукацыйнай галіны «Фізічная культура» («Адаптыўная фізічная культура») у розных узроставых групах выхаванцаў установы адукацыі. Пачынаючы з другой малодшай групы (ад 3 да 4 гадоў) прадугледжана правядзенне адных заняткаў на тыдзень на рэалізацыю адукацыйнага кампанента «Спартыўныя практыкаванні» (падрыхтоўка да плавання) адукацыйнай галіны «Фізічная культура» (пры наяўнасці басейна); двое заняткаў па адукацыйнай галіне «Фізічная культура» праводзяцца ў памяшканні (спартыўнай/музычнай зале) або на адкрытым паветры (стадыёне/фізкультурнай пляцоўцы) у любую пару года за выключэннем неспрыяльных умоў надвор’я (дождж, моцны вецер) і надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару, а таксама пры хуткасці руху паветра больш за 3 м/с і тэмпературы атмасфернага паветра -15 °С і ніжэй для дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў, -18 °С і ніжэй для дзяцей ва ўзросце ад 3 да 7 гадоў, -22 °С і ніжэй для дзяцей ва ўзросце ад 7 гадоў.

Рэалізацыя зместу адукацыйнага кампанента «Спартыўныя практыкаванні» (падрыхтоўка да плавання) адукацыйнай галіны «Фізічная культура» ажыццяўляецца ў розных формах арганізацыі фізкультурна-аздараўленчай дзейнасці: пры правядзенні індывідуальна-дыферэнцаваных заняткаў з дзецьмі, мерапрыемстваў актыўнага адпачынку (фізкультурны вольны час і святы, дні здароўя).

Пры адсутнасці басейна праводзяцца трое заняткаў па адукацыйнай галіне «Фізічная культура» ў памяшканні (спартыўнай/музычнай зале) або на адкрытым паветры (стадыёне/фізкультурнай пляцоўцы).

Пры гэтым варыянты для арганізацыі заняткаў на працягу тыдня з улікам пастаўленых задач, матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы адукацыі, умоў надвор’я і інш. могуць быць рознымі: напрыклад, адны заняткі ў басейне, адны – на адкрытым паветры (стадыёне/фізкультурнай

пляцоўцы), адны – у памяшканні (спартыўнай/музычнай зале); двое заняткаў на адкрытым паветры (стадыёне/фізкультурнай пляцоўцы), адны – у басейне; двое заняткаў у памяшканні (спартыўнай/музычнай зале), адны – на адкрытым паветры (стадыёне/фізкультурнай пляцоўцы).

Выхавацелем дашкольнай адукацыі праводзяцца з выхаванцамі наступныя формы арганізацыі фізкультурна-аздараўленчай дзейнасці:

ранішняя гімнастыка: штодня з выхаванцамі ва ўзросце ад аднаго года да трох гадоў у групавым памяшканні або на адкрытым паветры ў цёплую пару года (з улікам спрыяльнага праходжання перыяду адаптацыі); з выхаванцамі ва ўзросце ад 3 да 7 гадоў у чаргаванні з кіраўніком фізічнага выхавання (пры яго адсутнасці – штодня). Напрыклад, у панядзелак, сераду і пятніцу ранішняя гімнастыка можа быць праведзена ў музычнай зале выхавацелем дашкольнай адукацыі сумесна з музычным кіраўніком, які ажыццяўляе музычнае суправаджэнне фізічных практыкаванняў, а ў аўторак і чацвер – у спартыўнай зале кіраўніком фізічнага выхавання сумесна з выхавацелем дашкольнай адукацыі, які забяспечвае індывідуальнае суправаджэнне і дапамогу (пры неабходнасці) выхаванцам пры выкананні фізічных практыкаванняў;

заняткі па адукацыйнай галіне «Фізічная культура». Кратнасць правядзення выхавацелем дашкольнай адукацыі ранішняй гімнастыкі і колькасць заняткаў па адукацыйнай галіне «Фізічная культура» вызначаюцца кіраўніком у кожнай канкрэтнай установе адукацыі з улікам узроставых груп і штатнай колькасці педагагічных работнікаў, у тым ліку кіраўнікоў фізічнага выхавання;

рухомыя гульні і фізічныя практыкаванні на прагулцы, загартоўванне.

Акрамя таго, выхавацелем дашкольнай адукацыі на працягу дня ствараюцца ўмовы для арганізацыі самастойнай рухальнай дзейнасці выхаванцаў.

*Звяртаем увагу* на неабходнасць забеспячэння якаснай работы па ўзаемадзеянні педагагічных работнікаў з сем’ямі выхаванцаў пры растлумачэнні пытанняў арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстановах адукацыі з улікам патрабаванняў нарматыўных прававых актаў, напаўненні сайтаў устаноў адукацыі, інфармацыйных стэндаў ва ўзроставых групах матэрыяламі па прапагандзе здаровага ладу жыцця, фарміраванні культуры здароўя, прафілактыцы дзіцячага траўматызму, далучэнні да заняткаў фізічнай культурай і спортам, у тым ліку анонсамі і вынікамі правядзення мерапрыемстваў па гэтай тэматыцы.

## Рэалізацыя адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі

У дзіцячым садзе, санаторным дзіцячым садзе, спецыяльным дзіцячым садзе адукацыйная праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі можа рэалізоўвацца па адным або некалькіх профілях з вывучэннем адукацыйных галін на базавым узроўні, у дашкольным цэнтры развіцця дзіцяці – па некалькіх профілях з вывучэннем адукацыйных галін на павышаным узроўні з улікам меркавання бацькоў (законных прадстаўнікоў) навучэнцаў, іх схільнасцей, жаданняў і стану здароўя.

Праграмы аб’яднанняў па інтарэсах распрацоўваюцца ўстановамі адукацыі на аснове тыпавых праграм дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і з улікам індывідуальных адукацыйных патрэб выхаванцаў з АПФР. Тыпавыя праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі размешчаны на Інтэрнэт-партале Міністэрства адукацыі (*https://edu.gov.by/molodezhnaya-politika/glavnoe-upravlenie-vospitatelnoy-raboty-i-molodezhnoy-politiki/upravlenie-raboty/informatsiya/molodezhi/dopolnitelnoe-obrazovanie-dlya-detey-i-molodezhi*).

Праграмы аб’яднанняў па інтарэсах з базавым узроўнем вывучэння адукацыйнай галіны зацвярджаюцца кіраўніком установы адукацыі па ўзгадненні з яе заснавальнікам (для дзяржаўных устаноў адукацыі), з органам кіравання адукацыяй па месцы рэалізацыі адукацыйнай праграмы (для прыватных устаноў адукацыі і іншых арганізацый) у парадку, які вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

Праграмы аб’яднанняў па інтарэсах з павышаным узроўнем вывучэння адукацыйнай галіны зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі пры наяўнасці станоўчых заключэнняў арганізацыі, якая ажыццяўляе навукова-метадычнае забеспячэнне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

Адукацыйны працэс ва ўстановах адукацыі пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі арганізуецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі з улікам асаблівасцей, указаных у главе 44 Кодэкса, і можа ажыццяўляцца ў аб’яднаннях па інтарэсах або індывідуальна. Згодна з пунктам 9 артыкула 235 Кодэкса індывідуальная праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі вызначае асаблівасці атрымання дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі адоранымі вучнямі, вучнямі з ліку асоб з АПФР, а таксама вучнямі, якія па ўважлівай прычыне не могуць пастаянна ці часова наведваць заняткі.

Індывідуальныя праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі распрацоўваюцца на аснове тыпавых праграм дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ўстановамі адукацыі і зацвярджаюцца іх кіраўнікамі.

Аб’яднанне па інтарэсах ствараецца з ліку дзяцей ад 2 да 7 гадоў і старэйшых на аснове агульнай цікавасці да канкрэтнага напрамку дзейнасці. Названыя аб’яднанні могуць быць аднаўзроставымі і

рознаўзроставымі, ствараецца для работы з пераменным складам навучэнцаў.

Напаўняльнасць аб'яднання па інтарэсах складае ад 8 да 10 навучэнцаў. Напаўняльнасць аб'яднання па інтарэсах для навучэнцаў з ліку асоб з АПФР складае ад 6 да 8 чалавек.

Напаўняльнасць аб'яднання па інтарэсах, у якім адукацыйны працэс арганізаваны для навучэнцаў з АПФР і іншых навучэнцаў, складае пры навучанні ва ўзросце ад 2 да 6 гадоў не больш за 6 чалавек, з якіх не менш за 2 чалавекі навучэнцы з АПФР, а пры навучанні асоб ва ўзросце ад 7 гадоў і старэйшых – не больш за 10 чалавек, з якіх не менш за 3 чалавекі навучэнцы з АПФР.

Заснавальнік установы адукацыі можа ўстанаўліваць меншую напаўняльнасць аб'яднання па інтарэсах, групы.

У выпадках, прадугледжаных вучэбна-праграмнай дакументацыяй адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, аб'яднанні па інтарэсах могуць дзяліцца на падгрупы.

Формамі арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі з'яўляюцца заняткі, іншыя формы.

Працягласць заняткаў устанаўліваецца з улікам санітарных норм, правіл і гігіенічных нарматываў.

У адпаведнасці з пунктам 19 Палажэння аб установе дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 25 ліпеня 2011 г. № 149 (у рэдакцыі пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 19 верасня 2022 г. № 318), улік заняткаў вядзецца ў журнале планавання і ўліку работы аб'яднання па інтарэсах.

## Асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстановах агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі

Установы агульнай сярэдняй адукацыі (школа-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, пачатковая школа, базавая школа, сярэдняя школа), установы спецыяльнай адукацыі (спецыяльная школа-інтэрнат, спецыяльная школа) пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі павінны кіравацца заканадаўствам у сферы дашкольнай і спецыяльнай адукацыі.

Адукацыйны працэс у названых відах устаноў адукацыі ажыццяўляецца ўвесь год і арганізуецца ў рэжыме пяцідзённага вучэбнага тыдня, выхаванцы могуць аб’ядноўвацца ў групы аднаго або рознага ўзросту.

Вучэбныя планы названых відаў устаноў адукацыі распрацоўваюцца на аснове тыпавога вучэбнага плана дашкольнай адукацыі, тыпавога вучэбнага плана спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі з улікам асаблівасцей кантынгенту выхаванцаў і рэсурснага (кадравага і матэрыяльна-тэхнічнага) забеспячэння і зацвярджаюцца кіраўніком установы адукацыі.

Пры наяўнасці ва ўстанове адукацыі рознаўзроставай групы выхаванцаў колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне адукацыйных галін разлічваецца для кожнага ўзросту асобна на аснове тыпавога вучэбнага плана дашкольнай адукацыі, тыпавога вучэбнага плана спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі.

## Асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу ў рознаўзроставых групах

У рознаўзроставую групу могуць аб’ядноўвацца выхаванцы ва ўзросце ад 1 года да 7 гадоў. Напаўняльнасць рознаўзроставай групы не павінна перавышаць пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі 12 выхаванцаў, пры рэалізацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі – 10 выхаванцаў з улікам структуры і ступені цяжкасці парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці выхаванцаў з АПФР.

Заснавальнік установы адукацыі можа ўстанаўліваць іншую напаўняльнасць групы пры наяўнасці аб’ектыўных абставін, захаванні санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў у частцы ўмоў размяшчэння і рэжыму адукацыйнага працэсу, у тым ліку норм плошчы на аднаго выхаванца ва ўсіх памяшканнях са знаходжаннем выхаванцаў.

Магчымы наступныя варыянты аб’яднання выхаванцаў у рознаўзроставыя групы:

*сумежнага ўзросту:* 2 і 3 гады (узроставыя групы выхаванцаў ад 2 да 3 гадоў і ад 3 да 4 гадоў), 4 і 5 гадоў (узроставыя групы выхаванцаў ад 4 да 5 гадоў і ад 5 да 6 гадоў), 5 і 6 гадоў (узроставыя групы выхаванцаў ад 5 да 6 гадоў і ад 6 да 7 гадоў);

*адносна кантраснага ўзросту:* 2 і 4 гады (узроставыя групы выхаванцаў ад 2 да 3 гадоў і ад 4 да 5 гадоў), 3 і 5 гадоў (узроставыя групы выхаванцаў ад 3 да 4 гадоў і ад 5 да 6 гадоў), 4 і 6 гадоў (узроставыя групы выхаванцаў ад 4 да 5 гадоў і ад 6 да 7 гадоў);

*кантраснага ўзросту:* 2 гады і 5 гадоў (узроставыя групы выхаванцаў

ад 2 да 3 гадоў і ад 5 да 6 гадоў), 3 гады і 6 гадоў (узроставыя групы выхаванцаў ад 3 да 4 гадоў і ад 6 да 7 гадоў).

У рознаўзроставых групах распарадак дня з'яўляецца адзіным для ўсіх выхаванцаў, але з улікам іх узроставых магчымасцей, здольнасцей і патрэб уносяцца некаторыя змены ў рэжымныя працэсы. З малодшымі выхаванцамі рэжымныя працэсы пачынаюцца на 10–15 хвілін раней (у іншым парадку адбываецца толькі пад'ём выхаванцаў пасля дзённага сну – старэйшыя выхаванцы ўстаюць на 10–15 хвілін раней). Гэтыя рэжымныя моманты неабходны для таго, каб выхаванцы рознага ўзросту, аб'яднаныя ў адну групу, паслядоўна і паступова пераходзілі ад аднаго віду дзейнасці да другога.

Пры вызначэнні агульнага рэжыму дня для выхаванцаў двух сумежных узростаў за аснову бярэцца распарадак дня выхаванцаў старэйшага ўзросту, трох, чатырох узростаў – распарадак дня для выхаванцаў сярэдняга ўзросту (ад 4 да 5 гадоў).

Арганізацыя жыццядзейнасці выхаванцаў ва ўмовах рознаўзроставай групы шмат у чым вызначаецца зладжанасцю работы выхавацеля дашкольнай адукацыі і памочніка выхавацеля, дакладным размеркаваннем абавязкаў паміж імі.

Спецыяльна арганізаваную дзейнасць у рознаўзроставай групе можна ажыццяўляць з прымяненнем наступных падыходаў да арганізацыі заняткаў (гульні):

*паэтапны пачатак заняткаў (гульні):* паслядоўнае ўключэнне выхаванцаў у дзейнасць (пачатак заняткаў з адной узроставай падгрупы (старшай) з наступным уключэннем выхаванцаў больш малодшай узроставай катэгорыі);

*аднachасовы пачатак заняткаў (гульні) ва ўсіх узроставых падгрупах, паэтапнае завяршэнне заняткаў (гульні):* паслядоўнае завяршэнне дзейнасці ў адпаведнасці з узроставымі магчымасцямі выхаванцаў;

*правядзенне заняткаў з кожнай узроставай падгрупай выхаванцаў.*

Прыярытэтнай формай спецыяльна арганізаванай дзейнасці выхаванцаў рознаўзроставай групы з'яўляюцца інтэграваныя заняткі, якія прадугледжваюць аб'яднанне і ўзаемадапаўненне зместу некалькіх адукацыйных галін рэалізуемых вучэбных праграм, што дазваляе фарміраваць у выхаванцаў ранняга і дашкольнага ўзросту цэласную карціну аб аб'екце або з'яве навакольнага свету.

***Арганізацыя музычнай і фізкультурна-аздараўленчай дзейнасці ў рознаўзроставых групах***

У рознаўзроставых групах сумежнага ўзросту і адносна кантраснага ўзросту пры арганізацыі *слухання музыкі* магчыма ўспрыманне музычнага

твора, рэкамендаванага вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі, вучэбнымі праграмамі спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для адной з узроставых груп. Пры ўспрыманні музычнага твора дзецьмі больш старэйшага ўзросту неабходна звярнуць увагу на выкарыстаныя метады на этапе дыферэнцаванага ўспрымання (напрыклад, калі для групы дзяцей больш малодшага ўзросту найбольш дарэчным можа быць мімічнае, тактыльнае, рухальнае прыпадабненне характару гучання музыкі, то для групы больш старэйшых дзяцей можа выкарыстоўвацца вакальнае, тэмбрава-інструментальнае, polімастацкае прыпадабненне); у працэсе гутаркі больш старэйшых дзяцей неабходна падахвочваць да выказванняў аб музыцы. Прадуктыўным таксама можа аказацца метад кантраснага супастаўлення двух музычных твораў (па прынцыпе кантрасту або падабенства) з рэкамендаванага рэпертуару для абедзвюх узроставых груп. У гэтым выпадку педагагічны работнік у большай ступені актывізуе музычнае ўспрыманне дзяцей той узроставай падгрупы, якой гэты музычны твор адрасаваны.

Пры арганізацыі *пеўчай дзейнасці* дапушчальным з’яўляецца развучванне і выкананне дзецьмі рознага ўзросту (як правіла, сумежнага) песні з рэпертуару адной з узроставых груп у выпадку адпаведнасці пеўчага дыяпазону абодвум узростам і індывідуальным асаблівасцям пеўчых галасоў выхаванцаў. Магчымы варыянт развучвання песні дзецьмі больш старшага ўзросту і падпяванне асобных музычных фраз гэтай песні дзецьмі больш малодшага ўзросту, выкананне імі рухаў у адпаведнасці з тэкстам або настроем музыкі. Калі развучваецца песня, рэкамендаваная для дзяцей больш малодшага ўзросту, з дзецьмі больш старэйшага ўзросту можа быць арганізавана яе аркестроўка (у першую чаргу з удзелам гукавысотных дзіцячых музычных інструментаў), таксама дзеці больш старэйшага ўзросту могуць выконваць гэтую песню a capella, што дазволіць дадаткова надаць увагу чысціні інтаніравання больш старэйшых выхаванцаў. Песенная творчасць дазваляе праявіць індывідуальнасць кожнага дзіцяці з улікам яго ўзроставых магчымасцей – песенныя імправізацыі выхаванцаў могуць адрозніваецца тэкставай і меладычнай разгорнутасцю пры падабенстве прапануемых відаў творчых заданняў.

Арганізацыя *музычна-рытмічных рухаў* можа прадугледжваць выкарыстанне музычнага рэпертуару адной з узроставых груп, рухі пад музыку (практыкаванні, танцавальныя рухі) будуць выконвацца ў адпаведнасці з узроставымі магчымасцямі і праграмнымі патрабаваннямі. Плённым можа стаць сольнае і ансамблевае выкананне танцавальных рухаў дзецьмі больш старэйшага ўзросту на фоне масавых скокаў дзяцей больш малодшага ўзросту, выкананне дзецьмі больш старэйшага ўзросту ролі вядучых у скоках па тыпе «люстэрка», стымуляванне іх да стварэння больш разгорнутых танцавальных імправізацый. Рухомыя гульні з музыкай

таксама даюць дзецям больш старэйшага ўзросту магчымасць праявіць ініцыятыву, стаць вядучым, выконваць больш складаныя ролі ў гульні.

*Ігра на дзіцячых музычных інструментах (элементарнае музіцыраванне)* як від дзейнасці дазваляе дастаткова выразна дыферэнцаваць прапанаваныя выхаванцам living рознага ўзросту заданні. Аптымальнай формай у гэтым выпадку можа стаць змяшаны аркестр, які прадугледжвае выкананне на гукавысотных музычных інструментах дзецьмі больш старэйшага ўзросту і выкананне на шумавых інструментах дзецьмі больш малодшага ўзросту, а таксама выкананне ў ансамблі гукавысотных інструментаў дзецьмі больш старэйшага ўзросту. Дыферэнцаваць заданні можна і пры арганізацыі шумавога аркестра, у якім больш малодшыя дзеці могуць з дапамогай шумавых інструментаў вылучаць моцную долю, а больш старшыя – адзначаць рытмічны малюнак мелодыі і інш.

Пры арганізацыі відаў музычнай дзейнасці ў выпадку, калі прадугледжаны рэпертуар або вырашаемыя адукацыйныя задачы і фарміруемыя навыкі для дзяцей рознага ўзросту ў значнай ступені адрозніваюцца, безумоўна, пераважна арыентавацца на паэтапны пачатак (ён часцей будзе прадугледжваць слуханне музыкі, спевы дзецьмі больш старэйшага ўзросту) або заканчэнне заняткаў (музычна-рытмічныя рухі, музіцыраванне дзяцей больш старэйшага ўзросту, правядзенне музычна-дыдактычных гульняў і інш.).

У рознаўзроставых групах кантраснага ўзросту неабходна імкнуцца да арганізацыі музычнай дзейнасці з кожнай падгрупай выхаванцаў.

У рознаўзроставай групе заняткі (гульня) па рэалізацыі зместу адукацыйнай галіны «Фізічная культура» («Адаптыўная фізічная культура») арганізуюцца з улікам узросту і колькасці выхаванцаў і могуць праводзіцца па чарзе з дзецьмі старэйшай узроставай катэгорыі і малодшай. Эфектыўнасць адукацыйнага працэсу будзе вышэйшай, калі ў занятках адначасова прымаюць удзел дзеці кантраснага ўзросту: малодшыя (1–2 гады) і старэйшыя (5–7 гадоў). Пры гэтым выхаванцы старэйшага ўзросту выступаюць для малодшых прыкладам для пераймання, а малодшыя, паўтараючы рухальныя дзеянні старшых, займаюцца з большай цікавасцю.

У рознаўзроставай групе эфектыўна праводзіць такія віды заняткаў, як вучэбна-трэніровачныя, сюжэтна-гульнявыя.

*Вучэбна-трэніровачныя* заняткі накіраваны на вырашэнне аздараўленчых, адукацыйных і выхаваўчых задач, вызначаных вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі. Змест выкарыстаных фізічных практыкаванняў і гульняў плануецца з улікам узросту выхаванцаў, а таксама стану іх фізічнай падрыхтаванасці (сфарміраванасць рухальных уменняў і навыкаў, узровень развіцця фізічных якасцей дзіцяці). Вучэбна-трэніровачныя заняткі могуць будавацца:

на аднолькавым рухальным матэрыяле для малодшых і старэйшых выхаванцаў. У гэтым выпадку выкарыстоўваюцца візуальна аднолькавыя і падобныя віды фізічных практыкаванняў, якія, аднак, маюць розныя тэхнічныя характарыстыкі, шчыльнасць і працягласць рухальных дзеянняў (колькасць паўтораў);

на дыферэнцаваным рухальным матэрыяле, падабраным з улікам ўзроўню фізічнай падрыхтаванасці малодшых і старэйшых выхаванцаў. У гэтым выпадку выхаванцы, якія маюць высокі ўзровень фізічнай падрыхтаванасці, выконваюць заданні, накіраваныя на ўдасканаленне іх рухальных уменняў і навыкаў. Дзецям прапануецца выкананне практыкаванняў па схеме, малюнку, з нестандартнага зыходнага становішча, у новых умовах, з новым спалучэннем тэхнічных элементаў. Для выхаванцаў з нізкім узроўнем фізічнай падрыхтаванасці неабходна планаваць заданні, у якіх асаблівая ўвага надаецца тэхніцы выканання асноўных відаў рухаў з устаноўкай на іх якасны вынік. Пры гэтым кіраўнік фізічнага выхавання займаецца з выхаванцамі, якія маюць нізкі ўзровень фізічнай падрыхтаванасці, выхавацель дашкольнай адукацыі – з астатнімі дзецьмі.

У *сюжэтна-гульнявых фізкультурных занятках* задачы навучання дзяцей фізічным практыкаванням рэалізуюцца з дапамогай гульнявых практыкаванняў, аб’яднаных адзіным сюжэтам (казкі, апавяданні і інш.). Змест сюжэтна-гульнявых заняткаў можа быць аднолькавым для выхаванцаў старэйшага і малодшага ўзросту, паколькі рухальная задума рэалізуецца дзецьмі без спецыяльнай падрыхтоўкі. Старэйшыя дзеці, адлюстроўваючы рухамі сюжэт, ствараюць новыя кампазіцыі з засвоеных знаёмых элементаў, дэманструюць малодшым свой рухальны досвед. Малодшыя, беручы прыклад з іх, адкрываюць для сябе ўласныя рухальныя магчымасці, вучацца захоўваць у памяці выкананыя фізічныя практыкаванні, узбагачаюць свой рухальны досвед. Кіраўнік фізічнага выхавання на занятках асаблівую ўвагу надае забеспячэнню псіхалагічнага камфорту ўсім выхаванцам, што дасягаецца педагагічнай падтрымкай рухальных задум дзяцей і рознымі патрабаваннямі да якасці іх выканання.

## Арганізацыя адукацыйнага працэсу з выхаванцамі з сіндромам дэфіцыту ўвагі і гіперактыўнасці (далей – СДУГ)

Пры арганізацыі адукацыйнага асяроддзя для выхаванцаў з СДУГ усе лішнія раздражняльнікі выдаляюцца з поля зроку. Пры гэтым, змяншаючы колькасць раздражняльнікаў, павялічваюць інтэнсіўнасць іх уздзеяння. У такой асаблівым чынам арганізаванай прасторы дзеці з СДУГ могуць лепш сканцэнтраваць сваю ўвагу на прадметах, глыбей зразумець іх прыроду, праявіць цікавасць да сумеснай дзейнасці, адчуваць

задавальненне ад праведзенай работы або гульні. Гэта з’яўляецца асновай для далейшага іх развіцця і самастойнасці.

Працоўнае месца выхаванца з СДУГ павінна знаходзіцца па цэнтры групавога пакоя, удалечыні ад магчымых раздражняльнікаў (дзверы, акно). Стол і крэсла павінны быць адпаведнай росту дзіцяці вышыні, корпус цела і ступні ног зафіксаваныя ў статычным становішчы.

Рэжым дня павінен падпарадкоўвацца пэўнай нязменнай часавай структуры. У рабоце з дзецьмі з СДУГ неабходна ўлічваць, што іх максімальная працаздольнасць магчыма ў пачатку дня і ў пачатку заняткаў, горш за ўсё матэрыял засвойваецца ў канцы дня або ў канцы заняткаў.

Для эфектыўнай арганізацыі часу добра падыходзіць расклад у малюнках. Яго можна размясціць на спецыяльным стэндзе ў групе ўстановы адукацыі. На стэндзе ў патрэбнай паслядоўнасці размяшчаюцца віды дзейнасці, гульні і заняткі. Расклад у малюнках арганізуе дзейнасць дзяцей з СДУГ, папярэджваючы дэфіцытарнасць адвольных працэсаў увагі і павышаную псіхічную стамляльнасць.

Сістэмнасць падачы інфармацыі стварае сістэмна арганізаваную памяць, палягчае пошук неабходнай інфармацыі, развівае мысленне, зніжае нагрузку на ўвагу і забяспечвае сістэматызацыю матэрыялу пры запамінанні. Фармулёўкі, ілюстрацыі, афармленне не павінны ўтрымліваць нічога лішняга і адцягваючага. Прапанаваныя заданні для дзіцяці павінны ўяўляць сабой добра арганізаваную паслядоўнасць пэўных відаў дзейнасці, паміж якімі неабходна рабіць невялікія перапынкі. Кожны такі від дзейнасці прадстаўляецца кароткай інструкцыяй, адлюстраванай у малюнку або схеме, якая знаходзіцца перад вачыма дзіцяці. Інструкцыі павінны быць кароткімі або падзеленымі на кароткія часткі, для таго каб хапала аб’ёму аператыўнай памяці, не адбывалася выпадзення, замен, перастановак частак інфармацыі.

Сістэматызацыя любога матэрыялу ў такіх дзяцей праходзіць больш павольна, чым у іншых дзяцей. Таму важна пазнаёміць дзяцей з СДУГ з вывучаемым матэрыялам загадзя, што дазволіць засвоіць асноўныя апорныя моманты.

У пачатку заняткаў дзецям з СДУГ неабходна прапаноўваць больш даступныя і лёгкія па змесце заданні для далейшай паспяховай матывацыі да выканання заданняў больш складанага характару. Заканчэнне заняткаў павінна прадугледжваць выкананне задання больш простага па змесце. Такім чынам, у выхаванцаў з СДУГ ствараецца адчуванне паспяховасці і павышаецца іх самаацэнка.

Арганізацыя работы з выхаванцамі з СДУГ павінна адпавядаць дзвюм асноўным умовам:

заняткі павінны праходзіць у эмацыянальна прывабнай форме, тым самым павышаць успрыманне прад’яўляемай нагрузкі, паляпшаць якасць засваення матэрыялу і самакантролю;

ажыццяўляць падбор такіх гульняў, якія забяспечваюць трэніроўку адной функцыянальнай асаблівасці і не ўскладаюць нагрузку на ўсе астатнія дэфіцытарныя асаблівасці.

Павышанай псіхічнай і фізічнай стамляльнасці дзяцей з СДУГ спрыяе манатонная аднастайная работа. Таму вельмі важным з’яўляецца ўключэнне ў заняткі пастаяннай змены відаў дзейнасці (статычныя і дынамічныя практыкаванні). У адваротным выпадку пры ператамленні сціраюцца ўжо ўстаноўленыя сувязі і вынікам гэтага з’яўляецца цяжкасць у запамінанні і далейшай трансляцыі атрыманай інфармацыі.

## Планаванне дзейнасці ўстаноў адукацыі

У адпаведнасці з пастаўленымі задачамі гадавы план можа ўключаць ў сябе наступныя структурныя кампаненты.

1. **Аналіз работы за папярэдні год, задачы на будучы год.** Эфектыўнасць планавання шмат у чым залежыць ад якаснага аналізу выканання плана за папярэдні год, на аснове якога вызначаюцца задачы на наступны год (2–3 задачы). Ва ўстановах адукацыі, якія маюць 1–3 узроставыя групы, можа быць запланавана адна задача.

Асноўнымі патрабаваннямі да аналізу работы ўстановы адукацыі могуць выступаць выразнасць пабудовы па блоках (раздзелах) плана; лагічная паслядоўнасць выкладання матэрыялу; аргументаванасць, параўнанне з папярэднім навучальным годам; дакладнасць ацэнак, якія выключаюць суб’ектывізм; доказнасць вывадаў; канкрэтнасць і абгрунтаванасць прапаноў; магчымае прымяненне ілюстрацыйных матэрыялаў (графікі, табліцы, дыяграмы і інш).

2. **Арганізацыйна-педагагічныя мерапрыемствы:** арганізацыя адукацыйнай дзейнасці, якую прадастаўляе ўстанова адукацыі; фарміраванне і абсталяванне развіццёвага прадметна-прасторавага асяроддзя; узаемадзеянне з зацікаўленымі органамі і арганізацыямі; перыядычнасць павышэння кваліфікацыі педагагічных работнікаў; арганізацыя дзейнасці педагагічных саветаў і інш.

3. **Работа з педагагічнымі работнікамі:** формы павышэння прафесійнага ўзроўню педагагічных работнікаў у міжкурсавы перыяд; дыягнастычная работа; падрыхтоўка да атэстацыі педагагічных работнікаў; вывучэнне, абагульненне, укараненне, распаўсюджванне эфектыўнага педагагічнага вопыту; самаадукацыя педагагічных работнікаў; эксперыментальная (інавацыйная) дзейнасць педагагічнага калектыву і інш.

4. **Выхаваўчая работа:** мерапрыемствы з удзелам выхаванцаў з улікам асноўных складнікаў працэсу выхавання, вызначаных адукацыйным стандартам дашкольнай адукацыі (правядзенне конкурсаў, выстаў, экскурсій, фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемстваў і г. д.).

5. **Псіхолага-педагагічнае і медыцынскае суправаджэнне адукацыйнага працэсу:** формы работы педагога-псіхолага, медыцынскіх работнікаў, педагога сацыяльнага.

6. **Узаемадзеянне з сем’ямі выхаванцаў:** формы работы па павышэнні псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці законных прадстаўнікоў непаўналетніх, уключэнні іх у адукацыйны працэс.

7. **Узаемадзеянне з установамі агульнай сярэдняй адукацыі:** формы работы з удзельнікамі адукацыйнага працэсу па забеспячэнні пераемнасці дашкольнай адукацыі і I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, у тым ліку ў частцы гатоўнасці выхаванцаў да навучання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

8. **Арганізацыя дзейнасці ўстановы адукацыі ў летні перыяд:** мерапрыемствы па падрыхтоўцы ўстановы адукацыі да дзейнасці ў летні перыяд, формы работы з удзельнікамі адукацыйнага працэсу з улікам палажэнняў інструктыўна-метадычнага пісьма Міністэрства адукацыі «Аб арганізацыі дзейнасці ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю, у летні перыяд», зацверджанага намеснікам Міністра адукацыі 29 мая 2023 г., патрабаванняў Правіл, іншых нарматыўных прававых і тэхнічных нарматыўных прававых актаў, лакальных прававых актаў.

9. **Кантроль:** віды і змест кантролю.

10. **Адміністрацыйна-гаспадарчая дзейнасць:** работа па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы адукацыі (набыццё сродкаў навучання, спартыўнага інвентару, тэхналагічнага абсталявання, правядзенне рамонтных работ і г. д.).

Падчас распрацоўкі плана вызначаюцца форма работы і тэма (або змест) у адпаведнасці з раздзелам. У прапанаваную структуру плана могуць уносіцца змены і дапаўненні з улікам умоў, спецыфікі дзейнасці ўстановы адукацыі.

Гадавы план работы ўстановы адукацыі пасля разгляду на пасяджэнні педагагічнага савета зацвярджаецца кіраўніком установы.

Ва ўстановах агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, планаванне работы на навучальны год па ўсіх напрамках сваёй дзейнасці

ажыццяўляецца як на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, так і на ўзроўні дашкольнай адукацыі.

Напрамкі дзейнасці вызначаюцца з улікам спецыфікі канкрэтнай ўстановы адукацыі і адлюстроўваюцца ў кожным раздзеле плана на навучальны год. Напрыклад, стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі выхаванцамі з АПФР і аказанне ім карэкцыйна-педагагічнай дапамогі; забеспячэнне пераемнасці дашкольнай адукацыі і I ступені агульнай сярэдняй адукацыі; арганізацыя работы з выхаванцамі ў летні аздараўленчы перыяд і інш.

## План рэалізацыі адукацыйнага працэсу ў групах ранняга і дашкольнага ўзросту

План рэалізацыі адукацыйнага працэсу ў групах ранняга і дашкольнага ўзросту можа ўключаць наступныя структурныя кампаненты.

1. **Задачы дзейнасці ўстановы адукацыі на навучальны год** (плануюцца на навучальны год).

2. **Навукова-метадычнае забеспячэнне:** пералік вучэбных выданняў (плануецца на навучальны год, магчыма актуалізацыя з улікам выпуску новых вучэбных выданняў).

3. **Узаемадзеянне з сем’ямі выхаванцаў:** формы і змест работы па павышэнні псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці законных прадстаўнікоў выхаванцаў (плануюцца на месяц).

Пры планаванні дзейнасці ўстановы адукацыі ў структурны кампанент плана «Узаемадзеянне з сем’ямі выхаванцаў» у межах форм работы па павышэнні псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці бацькоў (законных прадстаўнікоў) выхаванцаў і ўключэнні іх у адукацыйны працэс рэкамендуецца ўнесці работу па фарміраванні асноў грамадзянска-патрыятычнай культуры выхаванцаў, у тым ліку прывіцці ім агульначалавечых, гуманістычных каштоўнасцей, ідэй, перакананняў, якія адлюстроўваюць сутнасць беларускай дзяржаўнасці, і інш.

Міністэрства адукацыі *звяртае ўвагу* на неабходнасць узмацнення ва ўстанове адукацыі інфармацыйна-растлумачальнай работы з законнымі прадстаўнікамі навучэнцаў па розных пытаннях у сферы адукацыі, пачынаючы з выхавацеля дашкольнай адукацыі ўзроставай групы, якую наведвае дзіця, да кіраўніка ўстановы адукацыі.

У адпаведнасці з пасадавымі абавязкамі, вызначанымі АКДПС, выхавацелі дашкольнай адукацыі павінны вывучаць умовы жыцця і выхавання дзяцей, а таксама планаваць, арганізоўваць і праводзіць выхаваўчую, адукацыйную і аздараўленчую работу, накіраваную на рознабаковае развіццё асобы дзіцяці ў адпаведнасці з яго ўзроставымі і індывідуальнымі магчымасцямі, здольнасцямі і патрэбамі пры рэалізацыі

адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, праграмы выхавання і абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

4. **Індывідуальная работа з выхаванцамі:** змест работы па адукацыйных галінах вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі, вучэбных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі на аснове штодзённых назіранняў педагагічнага работніка і з улікам вынікаў дзіцячай дзейнасці (плануецца на месяц). Пры неабходнасці ўносяцца карэкціроўкі з улікам штодзённых назіранняў педагагічнага работніка за якасцю засваення выхаванцамі зместу вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі, вучэбных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі як у спецыяльна арганізаванай, так і нерэгламентаванай дзейнасці. Карэкцыйна-развіццёвая работа плануецца і ажыццяўляецца педагогам-псіхолагам, настаўнікам-дэфектолагам.

5. **Загартоўванне**: асноўныя віды загартоўвання з улікам прынцыпаў загартоўвання, узроставых асаблівасцей выхаванцаў, сезонных змен, умоў установы адукацыі (плануецца на цёплы / халодны перыяды).

6. **Рухальная актыўнасць**: змест мерапрыемстваў распарадку дня. Ранішняя гімнастыка (плануецца два разы на месяц: 1-ы комплекс – на першы-другі тыдні, 2-і комплекс – на трэці-чацвёрты тыдні); рухомыя гульні і фізічныя практыкаванні на 1-й і 2-й прагулках (плануюцца штотыдзень); актыўны адпачынак (формы арганізацыі фізкультурна-аздараўленчай дзейнасці плануюцца на месяц з улікам узросту выхаванцаў групы і вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі, вучэбных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі).

7. **Спецыяльна арганізаваная дзейнасць, рэгламентаваная тыпавым вучэбным планам (гульня, заняткі)**, плануецца па адукацыйных галінах вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі на аснове раскладу гульняў, заняткаў на кожны дзень тыдня ў адпаведнасці з вучэбным планам установы адукацыі, вучэбнымі планамі спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі. Вызначаюцца тэма і мэта дзейнасці на працягу тыдня. У змест планавання ўключаюцца адукацыйная галіна і від заняткаў, тэма заняткаў, задачы, крыніцы планавання.

Планаванне спецыяльна арганізаванай дзейнасці ў рознаўзроставай групе ажыццяўляецца ў адпаведнасці з агульнымі патрабаваннямі, але мае асаблівасці. Пры планаванні франтальных форм работы варта ўлічваць адрозненне зместу (па ступені цяжкасці) і працягласці дзейнасці дзяцей кожнага ўзросту. Неабходна паказваць задачы ў дачыненні да кожнага ўзросту, прадугледзець дыферэнцаваныя заданні для дзяцей, у тым ліку заданні карэкцыйнай накіраванасці.

8. **Нерэгламентаваная дзейнасць выхаванцаў:** віды дзіцячай дзейнасці: прадметная, пазнавальная практычная, зносіны, гульнявая, мастацкая і інш. (плануецца на кожны тыдзень месяца з улікам тэматыкі тыдня). У змест планавання ўключаюцца форма работы, тэма і мэта.

Пры планаванні адукацыйнага працэсу ў групах ранняга ўзросту з мэтай якаснай рэалізацыі зместу вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі, вучэбных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі неабходна забяспечыць паўторнасць правядзення заняткаў.

## АСОБНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ З ВЫХАВАНЦАМІ З АПФР

### Арганізацыя адукацыйнага працэсу з выхаванцамі з парушэннем слыху

Пры рабоце з навучэнцамі з парушэннем слыху варта ўлічваць асаблівасці фарміравання ў іх гульнявой дзейнасці, неабходнасць правядзення работы па музычнай стымуляцыі, развіцці навыкаў зносін.

Ключавымі этапамі развіцця гульнявой дзейнасці выхаванцаў з парушэннем слыху з’яўляюцца: выкліканне і развіццё цікавасці да цацак і дзеянняў з імі, фарміраванне прадметна-адлюстравальнай гульнявой дзейнасці, накіраванай на авалоданне ўяўленнямі і ўменнямі дзейнічаць з цацкай у адпаведнасці з функцыянальным прызначэннем, фарміраванне сюжэтна-адлюстравальнай гульні, навучанне сюжэтна-ролевым гульням. Пры гэтым асноўнай стратэгіяй развіцця гульнявой дзейнасці выхаванцаў з парушэннем слыху ранняга і дашкольнага ўзросту выступае паэтапнае фарміраванне больш складаных спосабаў гульнявых дзеянняў на аснове ўзбагачэння жыццёвага досведу ва ўмовах эмацыянальнага і маўленчага ўзаемадзеяння з дарослым.

Адным з дзейсных сродкаў развіцця і карэкцыі вымаўленчага боку вуснага маўлення выхаванцаў дашкольнага ўзросту з парушэннем слыху з’яўляецца музычная стымуляцыя. Музычныя гукі выступаюць у якасці базы для авалодання навучэнцамі з парушэннем слыху ўяўленнямі аб якасцях маўленчых гукаў. Блізкасць маўленчага і музычнага інтанавання дазваляе ажыццяўляць перанос уменняў, сфарміраваных на аснове сродкаў музыкі, у працэс авалодання маўленчымі ўменнямі. Пры гэтым трэба ўлічваць, што гукі музыкі, як і іншыя немаўленчыя гукі, больш даступныя для ўспрымання на слых дзецям з парушэннем слыху.

Уключэнне ў адукацыйны працэс з навучэнцамі з парушэннем слыху музычнай стымуляцыі патрабуе ўзгодненай работы настаўніка-дэфектолага і музычнага кіраўніка, выразнага вызначэння задач карэкцыйнай работы,

вырашэнне якіх будзе ажыццяўляцца з выкарыстаннем сродкаў музычнай стымуляцыі.

Да прыярытэтных задач выхавання і навучання выхаванцаў дашкольнага ўзросту з парушэннем слыху адносіцца фарміраванне і развіццё звязнага маналагічнага маўлення як сродку зносін, пазнання і сацыялізацыі. Гэта абумоўлена важнасцю фарміравання на ўзроўні дашкольнай адукацыі асноўных тэкставых уменняў, якія складаюць базу для авалодання тэкставай кампетэнтнасцю на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі.

У адукацыйным працэсе з выхаванцамі з парушэннем слыху работа з тэкстам ажыццяўляецца ў двух напрамках. З аднаго боку, фарміраванне ўменняў успрымаць, разумець і ўзнаўляць тэксты – адна з задач карэкцыйных заняткаў. З другога боку, тэкст з’яўляецца адным са сродкаў авалодання зместам адукацыйных галін на ўзроўні дашкольнай адукацыі.

Пры планаванні работы над тэкстам настаўніку-дэфектолагу сумесна з выхавацелем дашкольнай адукацыі рэкамендуецца:

падабраць тэксты, над якімі будзе ажыццяўляцца работа, з улікам узроўню слыхамаўленчага развіцця выхаванцаў;

адаптаваць змест тэксту з улікам узроўню слыхамаўленчага развіцця выхаванцаў (змяніць аб’ём, спрасціць лексіка-граматычныя сродкі);

вызначыць задачы і змест работы на кожных занятках, выкарыстаныя метадычныя прыёмы і віды работ, наглядныя і дыдактычныя сродкі.

Неабходна ўказаць на вядучую ролю настаўніка-дэфектолага пры вызначэнні шляхоў адаптацыі зместу, сродкаў і метадычных прыёмаў работы над тэкстам з улікам інварыянтных і варыятыўных асаблівых адукацыйных патрэб выхаванцаў. Так, варта абмеркаваць з выхавацелем дашкольнай адукацыі акустычныя ўмовы ўспрымання тэксту выхаванцамі з парушэннем слыху, прыёмы семантызацыі лексікі, віды работ над сэнсавым бокам тэксту, наглядныя апоры, якія мэтазгодна выкарыстоўваць пры рабоце з тэкстам («рухомыя» карціны, сюжэтныя карціны, серыі карцін) і інш.

Адным з ключавых крытэрыяў для вызначэння паказанняў да атрымання адукацыі дзецьмі з парушэннем слыху выступае ўзровень развіцця маўленчай дзейнасці.

*На этапе паступлення ва ўстанову адукацыі* ўзроўні развіцця маўлення выхаванцаў з парушэннем слыху ранняга ўзросту з улікам стану слыхавога ўспрымання, разумення маўлення і актыўнага маўлення характарызуюцца наступным чынам:

*аптымальны ўзровень* – здольнасць да апазнавання на слых добра знаёмых маўленчых адзінак; дыферэнцыяцыя на слых кароткіх (2–3 словы) сказаў пры выбары з двух-трох у сітуацыі абмежаванага нагляднага выбару; адрозненне слоў пры выбары з пяці; разуменне значэнняў адна- і

двухступеньчатых інструкцый; разуменне значэнняў знаёмых слоў (назоўнікаў на ўзроўні розных ступеней абагульнення, дзеясловаў, прыметнікаў, простых прыназоўнікаў); выкарыстанне ў самастойным маўленні двух- і трохслоўных сказаў; уменне весці просты дыялог на тэмы, блізкія сацыяльнаму досведу; адэкватны адбор лексічных і граматычных сродкаў у адпаведнасці з узростава-нарматыўнымі паказчыкамі;

*дастатковы ўзровень* – здольнасць да дыферэнцыяцыі на слых двухслоўных сказаў пры выбары з двух у сітуацыі абмежаванага нагляднага выбару (у асобных выпадках – пасля слыха-зрокавага ўспрымання); упэўненае распазнаванне слоўнага матэрыялу рознай акустычнай характарыстыкі пры выбары з трох; разуменне значэння аднаступеньчатых знаёмых інструкцый, значэнняў знаёмых слоў (назоўнікаў, у тым ліку асобных знаёмых абагульняючых паняццяў, дзеясловаў, прыметнікаў, некаторых простых прыназоўнікаў); самастойнае выкарыстанне добра знаёмых двухслоўных сказаў з парушэннем граматычнага афармлення; уменне весці кароткі дыялог на знаёмыя тэмы; адзінкавыя цяжкасці ў адборы лексікі і граматычных сродкаў;

*паніжаны ўзровень* – здольнасць да ўспрымання і распазнавання слыха-зрокава і на слых толькі добра знаёмых слоў пры выбары з двух-трох; пропускі слоў пры ўспрыманні фраз; разуменне значэнняў толькі знаёмых слоў (пераважна назоўнікаў і асобных дзеясловаў); выкарыстанне ў актыўным маўленні асобных слоў; цяжкасці ў самастойным адборы лексікі;

*абмежаваны ўзровень* – здольнасць да ўспрымання толькі асобных, добра знаёмых слоў, пераважна на аснове слыха-зрокавага ўспрымання, у асобных выпадках толькі наяўнасць рэакцыі на маўленчы матэрыял; абмежаванае разуменне маўленчага матэрыялу; выкарыстанне ў самастойным маўленні гукапераймання, асобных лепетных і поўных слоў.

**Пры пераходзе на I ступень агульнай сярэдняй адукацыі** ўзроўні развіцця маўлення дзяцей з парушэннем слыху на этапе завяршэння адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі характарызуюцца наступным чынам:

*аптымальны ўзровень* – адэкватнае ўспрыманне на слых 80 % і больш маўленчага матэрыялу, у тым ліку блізкага па акустычных прыметах; наяўнасць адзінкавых слыхавых памылак, якія не скажаюць сэнс маўленчых адзінак; дыферэнцаванае ўспрыманне маўлення на ўзроўні фонавага шуму; разуменне на ўзроўні сэнсавага сінтаксічнага цэлага, з адзінкавымі памылкамі пры вызначэнні лагічных сувязей; дастаткова поўнае ўзнаўленне праграмы маналагічнага паведамлення з асобнымі пропускамі маўленчых адзінак, якія не парушаюць агульную цэласнасць апавядання; сфарміравана ўменне працягваць і ініцыіраваць дыялог на знаёмую тэму, выкарыстоўваючы пытальна-адказавыя дыялагічныя

адзінствы; адэкватны адбор і выкарыстанне лексіка-граматычных сродкаў; наяўнасць асобных граматычных памылак;

*дастатковы ўзровень* – адэкватнае ўспрыманне на слых ад 50 да 79 % маўленчага матэрыялу; наяўнасць слыхавых памылак пры ўспрыманні акустычна блізкага маўленчага матэрыялу (скажэнняў і замен), пропускі асобных элементаў; цяжкасці пры ўспрыманні маўлення на ўзроўні шумавых перашкод; адэкватная інтэрпрэтацыя сэнсу ўспрынятых маўленчых выказванняў на ўзроўнях фактуальнага і часткова сэнсавага аналізу, наяўнасць памылак у вызначэнні лагічных сувязей; узнаўленне маналагічнага паведамлення з пропускам асобных сэнсавых звёнаў; сфармаванае ўменне адказваць на рэплікі-стымулы пры вядзенні дыялогу, наяўнасць цяжкасцей у ініцыіраванні дыялогу на знаёмыя тэмы (абмежаваны аб'ём – да двух дыялагічных адзінстваў); пераважна адэкватны адбор і выкарыстанне лексічных сродкаў; наяўнасць аграматычных сказаў;

*паніжаны ўзровень* – дыферэнцыяцыя ад 30 да 49 % маўленчага матэрыялу; цяжкасці ў адрозніванні блізкага па гучанні маўленчага матэрыялу; наяўнасць значнай колькасці пропускаў маўленчых адзінак і слыхавых памылак, якія ўплываюць на сэнс слоў (замены «выпадковага характару» словамі, блізкімі па гучанні; скажэнні); рэзкае зніжэнне выніковасці слыхавой дыферэнцыяцыі на фоне перашкод; разуменне маўлення зніжана, даступны толькі частковы фактуальны аналіз; фрагментарнае ўзнаўленне тэксту з выяўленым парушэннем цэласнасці; наяўнасць значных цяжкасцей пры вядзенні дыялогу, звязаных з фармулёўкай рэплік-стымулаў і рэплік-рэакцый; выяўленыя цяжкасці ў адборы і выкарыстанні лексіка-граматычных сродкаў;

*абмежаваны ўзровень* – дыферэнцыяцыя менш за 29 % маўленчага матэрыялу, шматлікія пропускі і скажэнні маўленчых адзінак тэксту; пагаршэнне вынікаў успрымання на фоне перашкод, разуменне на ўзроўні асобных слоў; пры ўзнаўленні маналагічных выказванняў рэзкае парушэнне цэласнасці тэксту, якое выяўляецца ў называнні асобных маўленчых элементаў; несфарміраванасць умення весці дыялог; выяўленыя цяжкасці ў адборы і выкарыстанні лексіка-граматычных сродкаў; выкарыстанне неадэкватных вербальных замен.

## Арганізацыя адукацыйнага працэсу з выхаванцамі з парушэннямі маўлення

Карэкцыйная работа з выхаванцамі дашкольнага ўзросту як з цяжкімі, так і з лёгкімі парушэннямі маўлення, якія выпраўляюцца ва ўмовах пункта карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, уключае папярэджанне парушэнняў пісьмовага маўлення (дыслексіі, дысграфіі і дызарфаграфіі), што

прадугледжвае развіццё псіхічных працэсаў і функцый, якія ляжаць у аснове авалодання чытаннем і пісьмом. Гэтая прапедэўтычная работа забяспечвае пераемнасць карэкцыйнай накіраванасці адукацыйнага працэсу з выхаванцамі з парушэннямі маўлення на ўзроўні дашкольнай адукацыі і на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

З мэтай папярэджання парушэнняў пісьмовага маўлення ў выхаванцаў асаблівую ўвагу неабходна надаць развіццю сенсаматорнай сферы (зрокавага і слыхавога ўспрымання, тэмпа-рытмічнага пачуцця, графаматорных уменняў), увагі, памяці, мыслення, усіх бакоў вуснага маўлення (вымаўленчага, лексіка-граматычнага, а таксама звязнага маўлення), удасканаленню фанематычнага слыху і на іх аснове фарміраванню базавых аперацый моўнага аналізу і сінтэзу і навучанню грамаце; развіццю матывацыі, уменняў планаваць сваю дзейнасць, выяўляць памылкі ў працэсе дзейнасці і г. д.

Для выяўлення выхаванцаў, якія маюць схільнасць да парушэнняў чытання, рэкамендуецца праводзіць скрынінгавае вывучэнне з выкарыстаннем стандартызаванай методыкі А. М. Корнева «Методыка ранняга выяўлення дыслексіі» і па яго выніках удакладняць змест планаванай карэкцыйнай работы і кансультавання бацькоў (законных прадстаўнікоў) выхаванцаў па пытаннях папярэджання парушэнняў пісьмовага маўлення на наступных этапах навучання.

## Арганізацыя лагапедычнай дапамогі ва ўмовах пункта карэкцыйна-педагагічнай дапамогі

Выхаванцам з АПФР, якія засвойваюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі і маюць парушэнні маўлення, арганізуецца аказанне карэкцыйна-педагагічнай дапамогі ва ўмовах пункта карэкцыйна-педагагічнай дапамогі (далей – ПКПД) установы адукацыі.

У ПКПД могуць залічвацца выхаванцы з парушэннем слыху, кампенсаваным кахлеарным імплантам, парушэннямі зроку, цяжкасцямі ў навучанні, парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату, расстройствамі аўтыстычнага спектра, якія засвойваюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі і маюць парушэнні маўлення.

У ПКПД могуць быць скамплектаваны наступныя групы навучэнцаў з парушэннямі маўлення:

з фанетычнымі парушэннямі маўлення (дыслаліяй, дызартрыяй, рыналаліяй);

з фанетыка-фанематычным недаразвіццём маўлення (дыслаліяй, дызартрыяй, рыналаліяй);

з нярэзкім выяўленым агульным недаразвіццём маўлення (далей – АНМ): няўскладненым варыянтам АНМ і ўскладненым варыянтам АНМ (пры дызартрыі і рыналаліі);

з парушэннямі тэмпа-рытмічнага боку маўлення (заіканнем лёгкай ступені, тахілаліяй).

Нярэзка выяўленае АНМ і фанетыка-фанематычнае недаразвіццё маўлення дыягнастуюцца пачынаючы са старшага дашкольнага ўзросту. Іх наяўнасць, як і наяўнасць абумоўленых імі парушэнняў чытання ў навучэнцаў, перашкаджае паспяховаму засваенню адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі і з’яўляецца асноўным паказаннем для залічэння ў ПКПД.

Задачы лагапедычнай работы вырашаюцца ў залежнасці ад тыпалогіі (як сукупнасці сімптомаў) маўленчага расстройства, якая вызначаецца ў працэсе дыферэнцыяльнай дыягностыкі парушэнняў маўлення.

Дыягностыка не павінна быць арыентавана толькі на колькасную ацэнку. Спалучэннем колькаснага і якаснага падыходаў забяспечваецца аб’ектыўная карціна ацэнкі стану маўлення, падрабязная характарыстыка структуры маўленчага парушэння. Вынікі абследавання ў пачатку і канцы навучальнага года фіксуюцца ў карце абследавання навучэнца (у заключэнні адлюстроўваецца дынаміка ў маўленчым развіцці дзіцяці).

## Арганізацыя адукацыйнага працэсу з выхаванцамі з цяжкасцямі ў навучанні

Пры рабоце з выхаванцамі з цяжкасцямі ў навучанні асаблівая ўвага надаецца папярэджанню спецыфічнага расстройства арыфметычных навыкаў (дыскалькуліі). Пры гэтым значным з’яўляецца вывучэнне стану ў выхаванцаў далікавых колькасных уяўленняў, несфарміраванасць якіх у дзяцей старшага дашкольнага ўзросту можа сведчыць аб фактары рызыкі ўзнікнення дыскалькуліі.

У ПКПД папярэджанне дыскалькуліі ў выхаванцаў з цяжкасцямі ў навучанні можа вылучацца як самастойны раздзел каляндарна-тэматычнага планавання. У спецыяльных дзіцячых садах, спецыяльных групах, санаторных спецыяльных групах, групах інтэграванага навучання і выхавання, санаторных групах інтэграванага навучання і выхавання работу па папярэджанні дыскалькуліі рэкамендуецца планаваць у межах карэкцыйных заняткаў па развіцці пазнавальнай дзейнасці.

Найважнейшай задачай і абавязковым складнікам гэтай работы з’яўляецца фарміраванне ў выхаванцаў колькасных уяўленняў і ўменняў дзейнічаць з колькасцю, што прадугледжвае выкарыстанне адпаведнага матэрыялу і атрымлівае адлюстраванне ў фармулёўцы тэм заняткаў у каляндарна-тэматычным планаванні (напрыклад, «Адносіны адзін–многа,

многа–мала», «Адносіны больш, менш, роўна», «Утварэнне мноства, роўнага дадзенаму» і г. д.).

Пры планаванні заняткаў па папярэджанні дыскалькуліі неабходна мець на ўвазе, што пераход да дзеянняў з апорай на зрокава-прасторавае ўспрыманне павінен ажыццяўляцца па меры засваення практычных дзеянняў па пераўтварэнні прадметных мностваў і ўменні прагаворваць гэтыя дзеянні. Акрамя таго, у змесце заняткаў прадугледжваецца вырашэнне задач фарміравання сенсаматорных функцый, лагічных аперацый, сукцэсіўных і сімультанных працэсаў, маўленчых перадумоў матэматычнай дзейнасці, інтэграцыі маўленчай і немаўленчай функцый пры фарміраванні элементарных матэматычных уяўленняў.

## Арганізацыя адукацыйнага працэсу з выхаванцамі з інтэлектуальнай недастатковасцю

Пры навучанні грамаце выхаванцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю змест работы прадугледжвае фарміраванне ў іх цікавасці да роднай мовы, да сродкаў яе сэнсавага зместу і выразнасці, выхаванне маўленчай увагі, маўленчага слыху, развіццё маўлення выхаванцаў, а таксама дапаўняе і дазваляе замацоўваць тыя ўяўленні, уменні і навыкі, якія выхаванец з інтэлектуальнай недастатковасцю атрымлівае на занятках па адукацыйнай галіне «Развіццё маўлення».

Асаблівая ўвага пры навучанні грамаце надаецца развіццю слыхавога, фанематычнага ўспрымання, карэкцыі недахопаў вымаўлення гукаў і ўмацаванню мышцаў артыкуляцыйнага апарату, пашырэнню ўяўленняў аб навакольным свеце, развіццю зрокава-прасторавага ўспрымання, маўлення выхаванцаў, дробных мышцаў рукі дзіцяці з мэтай падрыхтоўкі да авалодання навыкамі пісьма.

Заданні, накіраваныя на фарміраванне гатоўнасці выхаванцаў да авалодання граматай, уключаюцца ва ўсе віды заняткаў, якія праводзяцца з дзецьмі старшага дашкольнага ўзросту. Неабходна таксама ўлічваць характэрную для дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю нізкую матывацыю дзейнасці. У многіх з іх не ўзнікае патрэбы навучыцца пісаць, чытаць, пазнаваць новае і да т. п. У сувязі з гэтым узмацняецца значэнне спецыяльных метадаў стымулявання і матывацыі дзейнасці дзяцей.

## Арганізацыя адукацыйнага працэсу з выхаванцамі з расстройствамі аўтыстычнага спектра

Якасная своеасаблівасць псіхафізічнага развіцця выхаванцаў з расстройствамі аўтыстычнага спектра (далей – РАС) абумоўлівае мадыфікацыю і адаптацыю зместу адукацыі, сродкаў і ўмоў яго рэалізацыі,

а таксама ўстанаўлівае пэўныя патрабаванні да зместу карэкцыйных заняткаў з улікам асаблівых адукацыйных патрэб выхаванцаў з РАС (нарошчванне ведаў і ўменняў у кантэксце, памяншэнне аб'ёму разавай дозы вучэбнага матэрыялу, візуалізацыя матэрыялу, павышаная ўвага да сацыяльнай практыкі, неабходнасць узмацнення кампенсаторнай асновы іх навучання).

Вядучымі напрамкамі ў сістэме карэкцыйнай работы з выхаванцамі з РАС з'яўляецца фарміраванне сацыяльных паводзін, навыкаў камунікацыі і ўзаемадзеяння. Дэфіцыт спецыфічных навыкаў неабходна выпраўляць у пэўнай паслядоўнасці, рухаючыся ад простага пасільнага ўзаемадзеяння, арыентаванага на засяроджванне і элементарнае ўспрыманне, да складанага, навучальнага ўзаемадзеяння з правіламі; ад прыватнага дзеяння да агульнага ўмення, якое інтэгруе некалькі навыкаў, ад ўзаемадзеяння з аб'ектамі да сацыяльнага ўзаемадзеяння; ад знаёмства з асобнымі часткамі гульні да цэлага гульнявога ўзаемадзеяння ў правільнай паслядоўнасці.

Настаўнік-дэфектолаг на дыягнастычнай аснове вызначае ўзровень сфарміраванасці сацыяльных паводзін, навыкаў камунікацыі і ўзаемадзеяння, затым выбірае метады і прыёмы, якія адпавядаюць індывідуальным патрэбам выхаванца, яго магчымасцям і ўзроўню функцыянальнасці. Даныя дыягнастычнага абследавання складаюць аснову для адбору зместу, вызначэння мэты, задач і формы рэалізацыі карэкцыйных заняткаў, выбару абсталявання. У працэсе дыягнастычнага ўзаемадзеяння з выхаванцам вызначаецца, якія менавіта навыкі дзіця трэніруе спантанна, затым да іх дадаюцца заданні і гульні, блізкія па змесце, якія выклікаюць у яго эмацыянальны водгук.

У пачатку работы мэтай з'яўляецца не навучанне, а ўстанаўленне кантакту з выхаванцам. Адсутнасць водгуку або негатывізм з боку выхаванца не павінны прыводзіць да скарачэння спроб узаемадзеяння з ім і абмежавання яго магчымасцей у набыцці новага вопыту. Негатыўныя рэакцыі дзіцяці павінны стымуляваць настаўніка-дэфектолага да стварэння ўсё новых і новых умоў для сенсорнага, маторнага, маўленчага і сацыяльнага ўзбагачэння выхаванца. Галоўная задача заняткаў з выхаванцам з РАС – павысіць ступень яго ўключанасці ў прадметны і сацыяльны свет. Гэтаму спрыяюць навізна стымулу, візуальныя падказкі, падмацаванне, павышэнне ступені задавальнення ад дзейнасці.

Распрацоўку зместу карэкцыйных заняткаў варта пачынаць з вызначэння навыкаў, якія плануецца фарміраваць, або тых спосабаў паводзін, якія неабходна развіваць і/або карэкціраваць. Выбар навыкаў ажыццяўляецца на падставе даных, атрыманых падчас дыягностыкі: узроставая норма (наяўнасць навыку ў аднагодкаў), запыт законных прадстаўнікоў выхаванца, сацыяльная значнасць навыку, інтарэсы і перавагі выхаванца. Канструяванне зместу вучэбнага матэрыялу

карэкцыйных заняткаў мэтазгодна ажыццяўляць з улікам узроставых і функцыянальных паказчыкаў развіцця выхаванцаў, іх асаблівых адукацыйных патрэб.

У якасці актуальных напрамкаў рэалізацыі зместу карэкцыйных заняткаў могуць быць вылучаны наступныя: сацыяльная дасведчанасць; сацыяльнае кантактаванне; сацыяльнае навучэнне. Карэкцыйныя заняткі па фарміраванні навыкаў сацыяльных паводзін у выхаванцаў з РАС нацэлены на вырашэнне шэрагу задач: фарміраванне ўяўленняў аб сабе, блізкім і далёкім сацыяльным асяроддзі, вобраза пэўнай паводзіннай рэакцыі ў простых сацыяльных сітуацыях, уменняў устанаўліваць кантакты з людзьмі, рэалізоўваць сацыяльныя ролі; стымуляванне сацыяльнай актыўнасці, сацыяльнай цікавасці.

Да асноўных стратэгій правядзення настаўнікам-дэфектолагам карэкцыйных заняткаў з выхаванцамі з РАС адносяцца: стварэнне шматлікіх сітуацый для навучання; прымяненне візуальнай дапамогі ў выглядзе малюнкаў, жэстаў, картак і інш.; аказанне фізічнай дапамогі; прад’яўленне мадэлі паводзін або дэманстрацыя жаданых паводзін; вербалізацыя; выкарыстанне прамых і ўскосных указанняў.

Правядзенне карэкцыйных заняткаў прадугледжвае насычэнне дзіцячай дзейнасці эмацыянальна значнымі элементамі, арганізацыю натуральнага навучання (у менш структураваных умовах) і сацыяльнага падмацавання. Актывізацыя ўспрымання, перапрацоўкі і самастойнага ўзнаўлення інфармацыі і дзеянняў у розных сацыяльных сітуацыях можа быць забяспечана за кошт строгай алгарытмізацыі дзейнасці дзяцей. Алгарытмы даюць магчымасць выхаванцам з РАС адэкватна падзяляць дзеянні на этапы, напаўняць іх зместам і ўстанаўліваць парадак рэалізацыі. Навучанне праз асобныя пробы мае на ўвазе падзел навыку на менш складаныя элементы, кожны з якіх засвойваецца асобна. Выхаванцу гэта забяспечвае пэўную ступень камфорту, паколькі ён дзейнічае ў адпаведнасці з абмежаванай інструкцыяй (алгарытмам), атрымлівае падказкі, падмацаванні, назірае нейтральныя рэакцыі педагагічнага работніка на свае памылкі. Натуральнае з’яўленне або прад’яўленне жаданага стымулу (падмацавальніка), у тым ліку з боку аднагодкаў, або ліквідацыя (змяншэнне) непрыемнага стымулу непасрэдна пасля рэакцыі дазваляе спыніць непажаданыя або выклікаць пажаданыя паводзіны і будзе стымуляваць генералізацыю навыкаў і інтэграцыю выхаванца ў калектыў аднагодкаў. Генералізацыя навыкаў забяспечвае перанос навыкаў, набытых на занятках, у розныя сацыяльныя сітуацыі ў натуральным асяроддзі.

Эфектыўнасць карэкцыйных заняткаў па фарміраванні ў выхаванцаў з РАС навыкаў сацыяльных паводзін можа быць забяспечана пры ўмове выкарыстання як традыцыйных метадаў навучання (славесных, наглядных і практычных), так і спецыфічных (сенсорнай інтэграцыі, сацыяльных

гісторый, відэамадэлінгу, структуравання і візуалізацыі, навучальнага ўзаемадзеяння, адрознівання і інш.).

Выбар формы правядзення карэкцыйных заняткаў прадыктаваны зместам работы і канчатковым вынікам, на які арыентавана дзейнасць педагагічнага работніка. Так, фарміраванне сацыяльнай дасведчанасці мэтазгодна рэалізоўваць праз сістэму індывідуальных заняткаў з улікам асаблівасцей развіцця, магчымасцей і патрэб выхаванцаў. Фарміраванне навыкаў сацыяльнага кантактавання можа ажыццяўляцца як на індывідуальных (дзеянне з прадметам у прысутнасці дарослага, уступленне ў кантакт з дарослым з дапамогай прадмета, уступленне ў кантакт у адпаведнасці з простай інструкцыяй і інш.), так і на падгрупавых занятках (ініцыіраванне кантакту з аднагодкамі рознымі спосабамі, уступленне ў кантакт у працэсе гульні і інш.). Сацыяльнае навучэнне таксама аптымальна ажыццяўляць як на індывідуальных (дзеянне з бытавым прадметам у адпаведнасці з функцыянальным прызначэннем і інш.), так і на падгрупавых занятках (назіранне за дзеяннямі аднагодкаў, капіраванне простых жэстаў, дзеянняў, знаходжанне ў непасрэднай блізкасці з іншымі выхаванцамі, адказ на запрашэнне да ўзаемадзеяння, ажыццяўленне сенсорных абарон і інш.).

Да ўмоў эфектыўнай рэалізацыі зместу карэкцыйных заняткаў па фарміраванні сацыяльных паводзін, навыкаў камунікацыі і ўзаемадзеяння ў выхаванцаў з РАС адносяцца: насычанасць адукацыйнага асяроддзя, адаптацыя дыдактычных матэрыялаў з улікам асаблівых адукацыйных патрэб навучэнцаў, узгодненасць дзеянняў і ўплыву ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу, своечасовасць падмацаванняў, пасільнасць заданняў і ўлік функцыянальных магчымасцей выхаванцаў.

Дзейнасць выхавацеля дашкольнай адукацыі, які ажыццяўляе персанальнае суправаджэнне ў адукацыйным працэсе выхаванцаў з РАС, накіравана на рэалізацыю наступных задач:

адаптацыю выхаванца да ўмоў установы адукацыі;

стварэнне ўмоў для яго навучання і выхавання з улікам яго магчымасцей і асаблівых адукацыйных патрэб;

стварэнне ўмоў для сацыялізацыі выхаванца, уключэнне яго ва ўзаемадзеянне з педагагічнымі работнікамі, іншымі навучэнцамі;

стварэнне ўмоў для раскрыцця патэнцыяльных магчымасцей выхаванца.

Змест работы выхавацеля дашкольнай адукацыі, які забяспечвае персанальнае суправаджэнне, адлюстроўваецца ў плане работы (на месяц або паўгоддзе) і залежыць ад узросту дзіцяці з РАС, яго функцыянальных магчымасцей і абмежаванняў. План работы складаецца сумесна з настаўнікам-дэфектолагам, абмяркоўваецца з законнымі прадстаўнікамі выхаванца. Ён можа ўключаць наступныя раздзелы: напрамкі дзейнасці,

рэалізуемыя задачы, выкарыстаныя прыёмы работы, указанне тэрмінаў работы, заўвагі. У залежнасці ад магчымасцей дзіцяці з РАС па кожным напрамку вылучаюць дзве-тры канкрэтныя задачы. Напрыклад: фарміраваць уменне браць прапанаваны равеснікам прадмет, фарміраваць уменне прасіць паўтарыць упадабанае дзеянне, фарміраваць уменне знаходзіць сваю шафку ў раздзявальні, арганізаваць у памяшканні групы зону рэлаксацыі і адасаблення і г. д. Падбіраюцца прыёмы, накіраваныя на рэалізацыю пастаўленай задачы, вызначаюцца тэрміны рэалізацыі.

У раздзеле «Заўвагі» можа адзначацца эфектыўнасць падабраных прыёмаў. Пры неабходнасці ў план уносяцца карэктывы. Калі за вызначаны перыяд часу не ўдалося рэалізаваць пастаўленую задачу, праводзіцца сумеснае абмеркаванне і вызначэнне прычын (абмежаваныя тэрміны, неадпаведнасць магчымасцям дзіцяці з РАС, няправільна падабраныя прыёмы работы і інш.). Наступныя планы складаюцца на аснове аналізу папярэдніх.

Таксама ў выхавацеля дашкольнай адукацыі, які забяспечвае персанальнае суправаджэнне дзяцей з РАС, маюцца копіі каляндарна-тэматычнага планавання выхавацеля дашкольнай адукацыі, настаўніка-дэфектолага для вызначэння магчымасцей уключэння дзіцяці з РАС у дзейнасць на занятках.

Адной з важных умоў эфектыўнасці адукацыйнага працэсу з выхаванцамі з РАС выступае ўдасканаленне ўзаемадзеяння з іх законнымі прадстаўнікамі з мэтай забеспячэння аднастайнасці ўздзеяння, пераемнасці карэкцыйнай работы і замацавання атрыманых навыкаў у натуральным асяроддзі.

## Асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу з выхаванцамі з парушэннямі зроку

У рабоце з выхаванцамі з парушэннямі зроку рэкамендуецца звяртаць увагу на фарміраванне іх самастойнасці ў розных сферах жыццядзейнасці, здольнасці праяўляць валявое намаганне, развіццё сацыяльнай актыўнасці, цікавасці да паўсядзённых падзей, жыцця дарослых і аднагодкаў, умення выконваць правілы культуры зносін і паводзін, здольнасці суперажываць, клапаціцца пра старэйшых і малодшых, дапамагаць, усведамляць і праяўляць свае індывідуальныя магчымасці, творчыя здольнасці, што ў далейшым забяспечыць іх паспяховую сацыялізацыю.

Пры парушэннях зроку выяўляюцца спецыфічныя асаблівасці ў маўленчым развіцці выхаванцаў. Даныя даследаванняў паказваюць, што больш чым трэцяя частка выхаванцаў дашкольнага ўзросту з парушэннямі зроку маюць усе тыпы парушэнняў вымаўлення, фанетыка-фанематычнае недаразвіццё маўлення, агульнае недаразвіццё маўлення. Маўленне для

дзіцяці дашкольнага ўзросту з парушэннямі зроку, з’яўляючыся сродкам зносін і пазнання навакольнага свету, паступова становіцца асноўнай крыніцай кампенсацыі. Умовы двухмоўя могуць істотна ўскладніць гэты працэс. У групе другога ранняга ўзросту (ад 1 года да 2 гадоў), першай малодшай групе (ад 2 да 3 гадоў), у першым паўгоддзі ў другой малодшай групе (ад 3 да 4 гадоў) устаноў адукацыі з беларускай (рускай) мовай навучання і выхавання рэкамендуецца рэалізоўваць змест адукацыйнай галіны «Развіццё маўлення» («Развитие речи») у нерэгламентаванай дзейнасці праз арганізацыю маўленчых зносін: слуханне фальклорных і мастацкіх твораў на беларускай (рускай) мове, выкарыстанне асноўных форм маўленчага этыкету ў сітуацыях зносін, засваенне назваў прадметаў блізкага бытавога акружэння і т. п.

У сярэдняй (ад 4 да 5 гадоў) і старшай (ад 5 да 6 і ад 6 да 7 гадоў) групах пры рэалізацыі зместу названых адукацыйных галін рэкамендуецца выкарыстоўваць адаптаваны змест вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі для выхаванцаў з парушэннямі зроку. *Звяртаем увагу*, што раздзел «Маўленчыя зносіны» абноўленага зместу вучэбнай праграмы адпавядае зместу, які прадстаўлены ў адукацыйнай галіне «Дзіця і грамадства» адаптаванага зместу вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі для выхаванцаў з парушэннямі зроку (раздзелы «Узаемадзеянне з аднагодкамі і дарослымі», «Гульнявая дзейнасць»).

Пры рэалізацыі зместу адукацыйнай галіны «Выяўленчае мастацтва» рэкамендуецца ў групе другога ранняга ўзросту (ад 1 года да 2 гадоў), першай малодшай групе (ад 2 да 3 гадоў) і ў першым паўгоддзі ў другой малодшай групе (ад 3 да 4 гадоў) заняткі аплікацыяй планаваць не часцей за адзін раз на месяц.

Заняткі па адукацыйнай галіне «Выяўленчае мастацтва» могуць праводзіцца сумесна выхавацелем дашкольнай адукацыі і настаўнікам-дэфектолагам (тыфлапедагогам). Пры гэтым тыфлапедагог ажыццяўляе фарміраванне спосабаў абследавання аб’ектаў, уменняў выконваць практычныя дзеянні з дапамогай інструментаў і спецыяльных прыстасаванняў (шаблонаў, трафарэтаў і інш.) на пачатковым этапе авалодання выяўленчымі навыкамі.

## Асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу з дзецьмі ранняга ўзросту з АПФР

У 2023/2024 навучальным годзе з мэтай забеспячэння даступнасці, якасці, бесперапыннасці і пераемнасці ранняга ўмяшання пры аказанні комплекснай дапамогі дзецям з АПФР і іх сем’ям, каардынацыі дзеянняў па своечасовым выяўленні, абмене звесткамі аб дзецях са згоды законных прадстаўнікоў, распаўсюджванні станоўчага досведу аказання

комплекснай дапамогі дзецям, максімальнага ахопу дзяцей, якія маюць патрэбу ў паслугах ранняга ўмяшання, ранняй комплекснай дапамогі, праводзіцца работа па арганізацыі міжведамаснага ўзаемадзеяння ўстаноў адукацыі, аховы здароўя і сацыяльнай абароны.

*Звяртаем увагу*, што міжведамаснае ўзаемадзеянне арганізуецца ў адпаведнасці з Інструкцыяй аб парадку правядзення мерапрыемстваў па раннім умяшальніцтве, зацверджанай пастановай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 23 красавіка 2021 г. № 40 (далей – пастанова № 40), Дарожнай картай удасканалення міжведамаснага ўзаемадзеяння пры аказанні дапамогі асобам з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, інваліднасцю і іх сем’ям, падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў на 2022–2025 гады, зацверджанай Міністэрствам адукацыі, Міністэрствам аховы здароўя і Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны, а таксама з рэкамендацыямі па арганізацыі міжведамаснага ўзаемадзеяння пры аказанні комплекснай медыка-псіхолага-педагагічнай дапамогі дзецям ранняга ўзросту з АПФР, у тым ліку інвалідам, распрацаванымі Міністэрствам аховы здароўя, Міністэрствам адукацыі, Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны (накіраваны для кіраўніцтва і выкарыстання ў рабоце пісьмом Міністэрства адукацыі ад 13 лістапада 2020 г. № 02-02-19/9209/дс/, размешчаны на Інтэрнэт-партале Міністэрства адукацыі (*https://edu.gov.by*), нацыянальным адукацыйным партале (*https://adu.by/ru*).

Ключавым арыенцірам ранняй комплекснай дапамогі на сучасным этапе выступае выяўленне і характарыстыка асаблівых адукацыйных патрэб дзіцяці з АПФР або фактарамі рызыкі ў развіцці, распрацоўка спецыяльных адукацыйных умоў, якія забяспечваюць задавальненне выяўленых асаблівых адукацыйных патрэб.

Пры аказанні ранняй комплекснай дапамогі ў ЦКРНіР змест работы з дзецьмі з АПФР або фактарам рызыкі парушэнняў развіцця вызначаецца індывідуальнай праграмай ранняй комплекснай дапамогі, якая распрацоўваецца спецыялістамі ЦКРНіР (настаўнікам-дэфектолагам, педагогам-псіхолагам, медыцынскім работнікам і інш.) сумесна з законнымі прадстаўнікамі непаўналетніх на аснове праграмы ранняй комплекснай дапамогі, вынікаў псіхолага-педагагічнай дыягностыкі і з улікам запытаў бацькоў (законных прадстаўнікоў) дзіцяці.

Асноўнымі арыенцірамі пры распрацоўцы індывідуальных праграм для дзяцей ад нараджэння да 1 года жыцця з’яўляюцца развіццё эмацыянальных зносін са значным дарослым, усіх відаў успрымання, асноўных рухаў і дзеянняў з прадметамі, дамаўленчых рэакцый і маўлення. У рабоце з дзецьмі ад 1 года да 3 гадоў акцэнт робіцца на развіцці прадметных дзеянняў, фарміраванні перадумоў гульнявой дзейнасці, развіцці зносін і маўлення.

Індывідуальныя праграмы ранняй комплекснай дапамогі распрацоўваюцца на тэрмін ад трох да шасці месяцаў.

Алгарытм першаснай распрацоўкі індывідуальнай праграмы ранняй комплекснай дапамогі ўключае:

вывучэнне запыту сям'і, якая выхоўвае дзіця з фактарам рызыкі парушэнняў развіцця або парушэннем псіхафізічнага развіцця, супастаўленне з заключэннем і рэкамендацыямі псіхолага-медыка-педагагічнай камісіі;

аналіз сумесна з законнымі прадстаўнікамі дзіцяці яго функцыянальных магчымасцей у межах кожнага напрамку развіцця, вызначэнне яго асаблівых адукацыйных патрэб і патэнцыялу развіцця;

вызначэнне іерархіі асноўных напрамкаў ранняй комплекснай дапамогі ў рабоце з канкрэтным дзіцем;

вызначэнне задач, зместу і метадычных прыёмаў работы па кожным з напрамкаў развіцця на тэрмін рэалізацыі індывідуальнай праграмы ранняй комплекснай дапамогі;

дакументальнае афармленне індывідуальнай праграмы ранняй комплекснай дапамогі.

На этапе вывучэння запыту сям'і важна высветліць мэту звароту законных прадстаўнікоў дзіцяці, іх чаканні ў дачыненні да яго развіцця, растлумачыць і абмеркаваць рэкамендацыі, якія змяшчаюцца ў заключэнні ЦКРНіР. Вынікам становіцца аптымізацыя або ўдакладненне адукацыйнага запыту законных прадстаўнікоў непаўналетніх.

Сумесна з законнымі прадстаўнікамі дзіцяці складаецца характарыстыка яго функцыянальных магчымасцей, якія суадносяцца з нарматыўнымі паказчыкамі развіцця, абмяркоўваюцца магчымыя прычыны адставання, магчымасці развіцця ў найбліжэйшыя тэрміны (на перыяд распрацоўкі праграмы).

Вызначэнне задач, зместу і метадычных прыёмаў работы з канкрэтным дзіцем па кожным з раздзелаў работы ажыццяўляецца з улікам актуальных магчымасцей і патэнцыялу развіцця дзіцяці. Варта выключыць мэтавызначэнне агульнага характару («Развіваць разуменне маўлення навакольных»). Задача павінна быць канкрэтнай, напрыклад: фарміраваць уменне адгукацца на ўласнае імя, фарміраваць уменне па просьбе дарослага паказваць часткі цела (ногі, рукі, галава, жывот, спіна) і г. д. Педагагічным работнікам ЦКРНіР сумесна з законнымі прадстаўнікамі дзіцяці варта спланаваць віды і прыёмы работы (сумесныя дзеянні, дзеянні па перайманні, па славеснай інструкцыі і інш.), абмеркаваць віды дапамогі, якія могуць быць выкарыстаны пры ўзнікненні цяжкасцей.

Заключны этап – дакументальнае афармленне, абавязковае ўзгадненне з законнымі прадстаўнікамі дзіцяці з АПФР, зацвярджэнне

індывідуальнай праграмы ранняй комплекснай дапамогі кіраўніком установы адукацыі.

Комплексная ацэнка эфектыўнасці рэалізацыі індывідуальных праграм ранняй комплекснай дапамогі можа ўключаць характарыстыку дынамікі развіцця па кожнай з галін, ацэнку дасягнення пастаўленых мэт, прычын, якія абумовілі вынікі ніжэй за прагназуемыя.

Метадычныя рэкамендацыі да распрацоўкі індывідуальных праграм ранняй комплекснай дапамогі прадстаўлены ў вучэбна-метадычным дапаможніку «Ранняя комплексная помощь детям с особенностями психофизического развития и факторами риска в развитии» авторов С. Н. Феклистовой и др. (Национальный институт образования, 2022).

## Асаблівасці арганізацыі інтэграванага навучання і выхавання

У 2023/2024 навучальным годзе неабходна працягнуць работу па забеспячэнні якасці арганізацыі і зместу адукацыйнага працэсу ва ўмовах інтэграванага навучання і выхавання.

Пры арганізацыі інтэграванага навучання і выхавання адукацыйны працэс ажыццяўляецца ў спецыяльных групах, санаторных спецыяльных групах, групах інтэграванага навучання і выхавання, санаторных групах інтэграванага навучання і выхавання.

Напаўняльнасць спецыяльных груп, санаторных спецыяльных груп, груп інтэграванага навучання і выхавання, санаторных груп інтэграванага навучання і выхавання рэгламентавана артыкулам 273 Кодэкса.

На правядзенне заняткаў з выхаванцамі, якія па медыцынскіх паказаннях часова або пастаянна не могуць наведваць установу адукацыі і для якіх ствараюцца ўмовы для атрымання спецыяльнай адукацыі дома, з выхаванцамі груп інтэграванага навучання і выхавання, санаторных груп інтэграванага навучання і выхавання вылучаецца:

на аднаго выхаванца з інтэлектуальнай недастатковасцю, выхаванца з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату (са значнымі парушэннямі руху або яго адсутнасцю), выхаванца, які не чуе, невідушчага выхаванца, выхаванца з расстройствамі аўтыстычнага спектра – 3,5 гадзіны на тыдзень;

выхаванца, які слаба чуе або бачыць, выхаванца з цяжкімі парушэннямі маўлення, выхаванца з цяжкасцямі ў навучанні – 2,5 гадзіны на тыдзень.

Указаная колькасць гадзін у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, вучэбным планам інтэграванага навучання і выхавання на ўзроўні дашкольнай

адукацыі на бягучы навучальны год размяркоўваецца настаўнікам-дэфектолагам на адукацыйныя галіны і карэкцыйныя заняткі.

*Звяртаем увагу*, што пры стварэнні і камплектаванні груп інтэграванага навучання і выхавання, санаторных груп інтэграванага навучання і выхавання ва ўстанове адукацыі неабходна загадзя інфармаваць законных прадстаўнікоў выхаванцаў, якія не маюць АПФР, аб стварэнні такіх груп.

Абавязковым з’яўляецца правядзенне растлумачальнай работы аб асаблівасцях арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўмовах інтэграцыі.

## Асаблівасці арганізацыі дзейнасці ЦКРНіР

Псіхолага-медыка-педагагічнае абследаванне (далей – абследаванне) у ЦКРНіР носіць комплексны характар. У працэсе абследавання вывучаюцца асаблівасці працякання псіхічных працэсаў і сутнасць індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей дзіцяці, выяўляюцца другасныя па сваёй прыродзе парушэнні, якія могуць быць прычынай цяжкасцей у навучанні, вызначаюцца іх прычыны, ацэньваюцца ўзровень засваення зместу адукацыйных праграм і сфарміраванасць асноўных сацыяльных навыкаў, вызначаюцца шляхі кампенсацыі наяўнага парушэння, патэнцыяльныя магчымасці і перспектывы для інтэграцыі дзіцяці ў грамадства.

Пры ажыццяўленні дыягнастычнай дзейнасці забяспечваюцца:

камфортнасць умоў для правядзення абследавання;

выбар дыягнастычных методык у адпаведнасці з узростам, індывідуальнымі адукацыйнымі патрэбамі выхаванца;

выкарыстанне даступных інструкцый, сродкаў альтэрнатыўнай і дадатковай камунікацыі і іншых сродкаў зносін пры арганізацыі выканання дзіцем дыягнастычных заданняў;

выключэнне фармальнага падыходу пры афармленні пратакола абследавання, заключэння ЦКРНіР;

сістэматызацыя і ўпарадкаванне дакументаў, якія прадастаўляюцца бацькамі (законнымі прадстаўнікамі) выхаванцаў, і матэрыялаў, якія ўтвараюцца ў ходзе абследавання;

захаванне прававых, маральных і этычных норм, павагі, гонару і годнасці ўдзельнікаў абследавання ў перыяд яго падрыхтоўкі, правядзення і па яго выніках.

Важным складнікам работы спецыялістаў псіхолага-медыка-педагагічнай камісіі (далей – ПМПК) з’яўляецца збор інфармацыі аб дзіцяці, якую яны атрымліваюць з медыцынскіх дакументаў, што прадастаўляюцца для правядзення абследавання, педагагічнай

характарыстыкі дзіцяці, непасрэдна ў ходзе абследавання, а таксама маючы зносіны з законнымі прадстаўнікамі дзіцяці.

Педагагічная характарыстыка дзіцяці, якая прадастаўляецца законным прадстаўніком для правядзення абследавання, павінна ўключаць: агульныя звесткі аб дзіцяці, умовы яго выхавання ў сям'і; апісанне дасягненняў дзіцяці ў засваенні асноўных відаў дзейнасці, зместу адукацыйных галін вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі, вучэбных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі і авалоданні передумовамі вучэбнай дзейнасці; характарыстыку праяўлення пазнавальнай актыўнасці, увагі, сенсорных працэсаў, памяці, мыслення, уяўлення, асаблівасцей паводзін; інфармацыю аб становішчы дзіцяці ў калектыве аднагодкаў (патрэба дзіцяці ў сацыяльных кантактах з аднагодкамі, развіццё камунікатыўных і арганізацыйных уменняў, прызнанне дзіцяці аднагодкамі).

Варта звярнуць увагу на карэктныя зносіны спецыялістаў ПМПК з законнымі прадстаўнікамі дзіцяці. Неабходна стварыць умовы для даверлівай размовы з імі, атрымаць інфармацыю аб тым, што дзіця можа рабіць самастойна ў спакойнай сітуацыі (дома, з блізкімі), якія рэакцыі і навыкі ў побыце праяўляе, якая дапамога неабходна пры зносінах з незнаёмымі людзьмі і інш.

Важна вызначыць стаўленне законных прадстаўнікоў да навучання дзіцяці, іх гатоўнасць да супрацоўніцтва з педагагічнымі работнікамі. Спецыялісты ПМПК павінны выявіць не толькі праблемы, але і паказаць бацькам моцныя бакі дзіцяці, яго патэнцыял. Неабходна растлумачыць законным прадстаўнікам, што станоўчая дынаміка ў развіцці дзіцяці забяспечваецца ў выніку арганізацыі адукацыйнага працэсу з улікам яго індывідуальных адукацыйных патрэб.

Непасрэдна падчас абследавання, назіраючы за паводзінамі дзіцяці ў спецыяльна арганізаваных сітуацыях, у свабоднай дзейнасці, спецыялісты атрымліваюць уяўленне аб актуальным развіцці дзіцяці, ацэньваюць яго рухальнае, сенсорнае, маўленчае развіццё, камунікатыўныя навыкі, асаблівасці паводзін, перадумовы вучэбнай дзейнасці, пазнавальнае развіццё, сфарміраванасць навыкаў самаабслугоўвання. Вылучаныя параметры канкрэтызаваны ў пратаколе абследавання, дзе спецыялісты ПМПК падрабязна адзначаюць сфарміраванасць дзеянняў і ўяўленняў дзіцяці. Вынікі назірання вызначаюць індывідуальныя рэкамендацыі па стварэнні спецыяльных умоў для атрымання адукацыі.

Для работы з дзіцем ствараюць спецыяльныя сітуацыі, якія маюць канкрэтныя дыягнастычныя задачы і ўлічваюць паводзінныя асаблівасці дзіцяці. Зносіны і ўзаемадзеянне з дзіцем могуць адбывацца ў розных месцах і сітуацыях, напрыклад, на дыване, за сталом (дзіця сядзіць на крэсле ці стаіць). У выпадку ўзнікнення паводзінных праблем і

немагчымасці ўстанаўлення кантакту з дзіцем рэкамендуецца абмежавацца назіраннем за яго свабоднай дзейнасцю і фіксацыяй выконваемых ім дзеянняў з прадметамі, цацкамі і матэрыяламі, якія знаходзяцца ў памяшканні, дзе адбываецца абследаванне. Пры гэтым пажадана паступовае падключэнне спецыяліста да дзеянняў дзіцяці. Ацэнку сфарміраванасці навыкаў самаабслугоўвання пажадана праводзіць у натуральных сітуацыях, калі дзіця распранаецца, наведвае прыбіральню, мые рукі, апранаецца і г. д.

Правядзенне комплекснага абследавання прадугледжвае выкарыстанне стандартызаванага дыягнастычнага інструментарыю з улікам узроставых і псіхафізічных асаблівасцей дзіцяці.

Пры арганізацыі і правядзенні абследавання неабходна ўлічваць асаблівасці развіцця кожнага навучэнца, у тым ліку яго маўленчае развіццё. Варта вызначыць форму прад'яўлення інструкцыі, якую дзіця ўспрымае лепш за ўсё (слоўная, жэставая, паказ). Калі дзіця не валодае вербальным маўленнем, неабходна ўжываць сродкі альтэрнатыўнай камунікацыі. Абследуючы дзіця, якое не валодае вербальным маўленнем, пажадана выявіць адзін-два пераважныя для дзіцяці сродкі камунікацыі.

Калі дзіця адчувае цяжкасці ў разуменні звернутага да яго маўлення, не рэагуе на ўласнае імя, абследаванне праводзяць з выкарыстаннем метаду базальнай камунікацыі. Педагагічны работнік павінен успрымаць дзіця як субяседніка, партнёра па камунікацыі, звяртацца да дзіцяці і чакаць ад яго адказу. Варта заўсёды папярэджваць дзіця аб сваіх дзеяннях. Пачынаць зносіны з дзіцем пажадана з пэўнага звароту, напрыклад, з дотыку да пляча. Рэкамендуецца выкарыстоўваць пры зносінах дотык-прывітанне і дотык-развітанне. Такія дотыкі дапамогуць дзіцяці сарыентавацца ў сітуацыі. Варта ўважліва назіраць за сігналамі дзіцяці (змяненне дыхання, сэрцабіцця, тонусу мышцаў), заўважаць, на што і якім чынам дзіця рэагуе. Неабходна адказваць на рухі і гукі дзіцяці, паўтараць іх, «далучацца» да дзіцяці, рабіць паўзы, каб даць дзіцяці дастаткова часу на адказ.

У працэсе абследавання неабходна ўлічваць асаблівасці пазіцыянавання дзіцяці з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату, што можа паўплываць на паспяховасць выканання прапанаваных заданняў. Важна ўлічваць звыклае для дзіцяці становішча цела ў прасторы без выкарыстання або з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў. У выпадках, калі дзіця самастойна не змяняе становішча цела, але здольна знаходзіцца ў становішчы седзячы або стоячы, пры правядзенні абследавання яно можа сядзець на крэсле або стаяць на вертыкалізатары. Выконваць заданні дзіця можа ў становішчы лежачы на трапецыі. Галоўнае, падабраць «рабочую позу» – становішча, пры якім дзіцяці не патрабуецца вялікіх намаганняў для ўтрымання таза, корпуса і галавы ў стабільным стане, а таксама для паваротаў галавы і выканання мэтанакіраваных дзеянняў рукамі. Таксама

варта ўлічваць змены функцыянальных магчымасцей зроку і слыху пры змене позы або пры спецыяльнай арганізацыі пазіцыянавання.

Правядзенне абследавання можа быць абцяжарана з-за праблемных паводзін дзіцяці. У такіх выпадках неабходна, каб адзін са спецыялістаў пастараўся ўстанавіць эмацыянальны кантакт з дзіцем і паступова ўцягнуў яго ў працэс узаемадзеяння. У сітуацыях, калі праблемныя паводзіны становяцца сур’ёзнай перашкодай пры выяўленні асаблівасцей пазнавальнага развіцця, патэнцыяльных магчымасцей дзіцяці, вызначэнні асаблівых адукацыйных патрэб, спецыялісты ПМПК павінны растлумачыць законным прадстаўнікам, што такі стан дзіцяці будзе перашкаджаць, а ў асобных выпадках зробіць немагчымым фарміраванне базавых вучэбных навыкаў, вучэбных паводзін як неабходнай умовы для засваення зместу праграмнага матэрыялу. Неабходна даведацца ў законных прадстаўнікоў аб частаце і выяўленасці праблемных паводзін, чым, на іх погляд, абумоўлена іх з’яўленне і г. д.

Пры правядзенні комплекснага абследавання непасрэдна з дзіцем можа працаваць адзін або некалькі членаў ПМПК. У сітуацыі, калі з дзіцем працуе адзін спецыяліст, іншыя спецыялісты назіраюць за паводзіннымі рэакцыямі дзіцяці і фіксуюць вынікі назіранняў. Вынікам сумеснага абмеркавання з’яўляецца ацэнка асаблівасцей развіцця дзіцяці, якая дазваляе вызначыць яго асаблівыя адукацыйныя патрэбы і спецыяльныя ўмовы атрымання адукацыі.

## ВЫКАРЫСТАННЕ СУЧАСНЫХ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ, ІНТЭРНЭТ-РЭСУРСАЎ ВА ЎСТАНОВАХ АДУКАЦЫІ

Пры выкананні работ па распрацоўцы, суправаджэнні, эксплуатацыі і размяшчэнні афіцыйных інтэрнэт-сайтаў устаноў адукацыі варта забяспечыць няўхільнае выкананне патрабаванняў і рэкамендацый Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 лютага 2010 г. № 60 «Аб мерах па ўдасканаленні выкарыстання нацыянальнага сегмента сеткі Інтэрнэт» (далей – Указ), Палажэння аб парадку функцыянавання інтэрнэт-сайтаў дзяржаўных органаў і арганізацый, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29 красавіка 2010 г. № 645 (далей – Палажэнне), Інструкцыі аб рэгістрацыі даменных імёнаў у нацыянальнай даменнай зоне, зацверджанай загадам Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь ад 18 чэрвеня 2010 г. № 47 (далей – Інструкцыя).

Адказнасць за фарміраванне, вядзенне і забеспячэнне функцыянавання сайта ўстановы адукацыі, а таксама за яго адпаведнасць патрабаванням Указа, Палажэння і Інструкцыі ўскладаецца на кіраўніка ўстановы адукацыі.

Адміністрацыям устаноў адукацыі, органаў кіравання адукацыяй, інстытутам развіцця адукацыі варта забяспечыць сістэматычнае вывучэнне і аналіз зместу інфармацыі, якая размяшчаецца на афіцыйных інтэрнэт-сайтах устаноў адукацыі.

Адукацыйны працэс з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, электронных сродкаў навучання павінен быць арганізаваны з улікам патрабаванняў Санітарных норм і правіл «Патрабаванні пры рабоце з відэадысплейнымі тэрміналамі і электронна-вылічальнымі машынамі» (пастанова Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 28 чэрвеня 2013 г. № 59), ССЭП, інструктыўна-метадычнага пісьма Міністэрства адукацыі «Аб выкарыстанні сучасных інфармацыйных тэхналогій ва ўстановах адукацыі».

Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь (далей – НЦПІ) рэкамендавана ў адукацыйным працэсе ўстаноў адукацыі выкарыстоўваць афіцыйныя крыніцы прававой інфармацыі.

Першакрыніцай дакладнай і актуальнай прававой інфармацыі з'яўляецца эталонны банк даных прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, які фарміруецца НЦПІ і распаўсюджваецца ў складзе ІПС «ЭТАЛОН» і «ЭТАЛОН-ONLINE» (*www.etalonline.by*). Гэтыя сістэмы дазваляюць атрымаць доступ да афіцыйнай прававой інфармацыі ў актуальным стане і ўтрымліваюць не толькі ўвесь масіў заканадаўства Рэспублікі Беларусь, але і матэрыялы судовай і правапрымяняльнай практыкі, формы дакументаў.

*БД «Адукацыя»* змяшчае прававыя акты, якія рэгулююць грамадскія адносіны ў сферы адукацыі, пытанні атрымання адукацыі розных ступеней і узроўняў, сацыяльнай падтрымкі і абароны навучэнцаў, арганізацыі аздараўлення дзяцей, напрамкі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, у тым ліку па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў, акты міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, а таксама прававыя акты, якія рэгламентуюць прафесійную дзейнасць педагагічных работнікаў.

У *БД «Тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты»* ўключаны адукацыйныя стандарты і нарматыўныя прававыя акты, якія з'яўляюцца структурнымі элементамі навукова-метадычнага забеспячэння адукацыі (вучэбныя праграмы, вучэбныя планы і інш.), а таксама формы цэнтралізаваных і нецэнтралізаваных дзяржаўных статыстычных назіранняў, даведачная інфармацыя аб вядзенні дзяржаўнай справаздачнасці, формы ведамаснай справаздачнасці і ўказанні па іх запаўненні.

Усе дакументы, прадстаўленыя ў БД, сістэматызаваны па тэматычных раздзелах. Тэксты нарматыўных прававых актаў знаходзяцца ў актуальным стане.

## АБ ВЫКАНАННІ ЗАКАНАДАЎСТВА

# АБ ПЕРСАНАЛЬНЫХ ДАНЫХ

Функцыянаванне ўстаноў адукацыі непасрэдна звязана з апрацоўкай персанальных даных асоб, якія атрымліваюць дашкольную адукацыю, спецыяльную адукацыю на ўзроўні дашкольнай адукацыі, а таксама іх законных прадстаўнікоў.

Згодна з абзацам 8 артыкула 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 7 мая 2021 г. № 99-З «Аб абароне персанальных даных» (далей – Закон) усе без выключэння ўстановы адукацыі прызнаюцца аператарамі.

У сувязі з гэтым з 15 лістапада 2021 г. на іх ускладзены абавязак прывесці сваю дзейнасць у адпаведнасць з патрабаваннямі артыкула 17 Закона[1].

З улікам устаноўленых патрабаванняў заканадаўства аб персанальных даных і пазіцыі Нацыянальнага цэнтра абароны персанальных даных (далей – НЦАПД) установам адукацыі ў дачыненні да прымянення яго асобных палажэнняў у сваёй дзейнасці неабходна:

1) прызначыць асобу, адказную за ажыццяўленне ўнутранага кантролю за апрацоўкай персанальных даных, унесці неабходныя дапаўненні/змены ў службовую інструкцыю гэтага работніка.

Канкрэтныя кваліфікацыйныя патрабаванні, што прад’яўляюцца да работнікаў, на якіх ускладаюцца функцыі спецыяліста, які ажыццяўляе ўнутраны кантроль за апрацоўкай персанальных даных, прадстаўлены ў АКДПС «Пасады служачых для ўсіх відаў дзейнасці» (выпуск 1), зацверджаным пастановай Міністэрства працы Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 1999 г. № 159.

Прызначэнне асобы, адказнай за ажыццяўленне ўнутранага кантролю (ускладанне адпаведных абавязкаў на канкрэтнага спецыяліста), не здымае адказнасці з кіраўніка і іншых работнікаў установы адукацыі за невыкананне патрабаванняў заканадаўства аб персанальных даных;

2) скласці і падтрымліваць у актуальным стане рэестр апрацоўкі персанальных даных;

3) распрацаваць і зацвердзіць:

палажэнне аб арганізацыі ўнутранага кантролю за апрацоўкай персанальных даных;

дакументы, якія вызначаюць палітыку ў дачыненні да апрацоўкі персанальных даных (далей – Палітыка).

---

[1] Пакрокавы алгарытм дзеянняў аператараў з неабходнымі тлумачэннямі размешчаны на афіцыйным сайце Нацыянальнага цэнтра абароны персанальных даных Рэспублікі Беларусь (далей – НЦАПД) у раздзеле «Метадалагічныя дакументы» і даступны па спасылцы *https://cpd.by/pravovaya-osnova/metodologicheskiye-dokumenty-rekomendatsii/*.

Па рашэнні аператара гэта можа быць адзін дакумент або некалькі (напрыклад, палітыка ў дачыненні да апрацоўкі персанальных даных у працоўных адносінах, пры відэаназіранні, на сайце і г. д.).

Рэкамендацыі па складанні дакумента, які вызначае палітыку аператара (упаўнаважанай асобы) у дачыненні да апрацоўкі персанальных даных, размешчаны на афіцыйным сайце НЦАПД у раздзеле «Метадалагічныя дакументы» (https://cpd.by/pravovaya-osnova/metodologicheskiye-dokumenty-rekomendatsii).

*Звяртаем увагу* на неабходнасць размяшчэння Палітыкі на сайце ўстановы адукацыі на старонцы не ніжэй за другі ўзровень. Пры адсутнасці ва ўстановы адукацыі сайта забеспячэнне неабмежаванага доступу да Палітыкі ажыццяўляецца шляхам яе размяшчэння на інфармацыйных стэндах або іншымі спосабамі;

парадак доступу да персанальных даных, у тым ліку тых, якія апрацоўваюцца ў інфармацыйным рэсурсе (сістэме);

4) унесці змены ў службовыя абавязкі асоб, якія апрацоўваюць персанальныя даныя.

Варта прадугледзець у службовых інструкцыях работнікаў, якія ажыццяўляюць апрацоўку персанальных даных (выхавацеляў дашкольнай адукацыі, педагогаў-псіхолагаў і інш.), абавязак «выконваць устаноўлены заканадаўствам аб персанальных даных і лакальнымі прававымі актамі парадак апрацоўкі персанальных даных».

Пры неабходнасці пасадавыя абавязкі канкрэтных работнікаў (напрыклад, адказных за функцыянаванне інфармацыйнага рэсурсу (сістэмы)) у частцы рэалізацыі заканадаўства аб персанальных даных могуць быць дэталізаваны, у тым ліку зыходзячы са спосабаў арганізацыі аператарам выканання абавязкаў, прадугледжаных артыкулам 16 Закона.

У залежнасці ад працоўнай функцыі работніка ў яго службовую інструкцыю могуць быць уключаны абавязкі:

атрымліваць у неабходных выпадках згоду суб’екта персанальных даных на апрацоўку персанальных даных;

ажыццяўляць кантроль за адпаведнасцю тэрміну апрацоўкі персанальных даных заяўленым мэтам, спыняць апрацоўку персанальных даных, а таксама забяспечваць іх выдаленне або блакіраванне пры адсутнасці прававых падстаў для апрацоўкі персанальных даных;

забяспечваць прадастаўленне суб’ектам персанальных даных інфармацыі аб іх персанальных даных, а таксама аб прадастаўленні іх персанальных даных трэцім асобам, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных Законам і іншымі заканадаўчымі актамі;

забяспечваць доступ да персанальных даных ва ўстаноўленым парадку, весці ўлік такога доступу і выпадкаў прадастаўлення, распаўсюджвання персанальных даных трэцім асобам і да т. п.;

5) пазнаёміць работнікаў і іншых асоб, якія непасрэдна ажыццяўляюць апрацоўку персанальных даных ва ўстанове адукацыі, з палажэннямі заканадаўства аб персанальных даных;

6) запланаваць і арганізаваць навучанне асоб, адказных за ажыццяўленне ўнутранага кантролю за апрацоўкай персанальных даных, і асоб, якія непасрэдна ажыццяўляюць апрацоўку персанальных даных.

Патрабаванні да арганізацыі навучання па пытаннях абароны персанальных даных асобамі, адказнымі за ажыццяўленне ўнутранага кантролю за апрацоўкай персанальных даных, а таксама асобамі, якія непасрэдна ажыццяўляюць апрацоўку персанальных даных, устаноўлены Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 кастрычніка 2021 г. № 422 «Аб удасканаленні мер па абароне персанальных даных».

Таксама ўстановам адукацыі як аператарам неабходна забяспечыць рэалізацыю іншых арганізацыйных і тэхнічных мер, прадугледжаных Законам (напрыклад, распрацаваць форму згоды для выкарыстання ў выпадках, калі прававой падставай апрацоўкі выступае згода, арганізаваць фіксацыю і захоўванне інфармацыі аб прадастаўленні персанальных даных трэцім асобам (гэта могуць быць журналы, калі інфармацыя прадастаўлялася ў пісьмовым выглядзе, сістэма лагіравання ў інфармацыйным рэсурсе (сістэме)) і т. п.).

*Звяртаем увагу*, што на сайце НЦАПД размешчаны ўзоры неабходных дакументаў (*https://cpd.by/pravovaya-osnova/portfel-operatora/formy-dokumentov*), а таксама тлумачэнні пытанняў аб прымяненні Закона, у тым ліку падрабязныя тлумачэнні аб яго прымяненні ў сферы адукацыі (*https://cpd.by/pravovaya-osnova/metodologicheskiye-dokumenty-rekomendatsii; https://cpd.by/podgotovleny-razjasnenija-o-primenenii-zakona-o-zashhite-personalnyh-dannyh-v-sfere-obrazovanija).*
Адказы на актуальныя пытанні ў сферы абароны персанальных даных таксама аператыўна размяшчаюцца НЦАПД у тэлеграм-канале «Цэнтр персанальных даных» *(https://t.me/cpd_by).*